ПРОЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

Нядзеля, 31 кастрычніка 1937 г. № 56 (327)

Цана 20 кап.

ЛІТАРАТУРА і МАСТАЦТВА

Орган праўлення ССПБ і упраўлення па справах мастацтваў пры СНК БССР

Перадвыбарчая нарада прадстаўнікоў працоўных Менскай гарадской выбарчай акругі

ПРАДСТАЎНІКІ 190 тысяч ПРАЦОЎНЫХ МЕНСКАЙ ГАРАДСКОЙ ВЫБАРЧАЙ АКРУГІ ЗАКЛІКАЮЦЬ УСІХ ВЫБАРШЧЫКАЎ АКРУГІ АДДАЦЬ СВАЕ ГАЛАСЫ ЗА таварыша СТАЛІНА, ЗА таварыша ВАРАШЫЛАВА

Работнікі мастацтваў рыхтуюцца да выбараў

Мы знаходзімся напярэдадні двух найвялікшай важнасці гістарычных дат—20-годдзя Вялікай соцыялістычнай рэволюцыі і выбараў у Вярхоўны Совет СССР. Работнікі мастацтваў Совецкай Беларусі шырока разгарнулі перадкастрычніцкае соцыялістычнае спаборніцтва на лепшую пастаноўку юбілейных спектакляў. Усё шырэй і шырэй разгортваецца работа па падрыхтоўцы выбараў у Вярхоўны Совет, уцягваючы ў арбіту палітычнага жыцця работнікаў літаратуры і мастацтва.

Дваццаць шостага кастрычніка на перадвыбарчым сходзе пісьменнікаў г. Менска, у абстаноўцы высокага ўздыму і энтузіязма былі вызначаны ў якасці кандыдатаў у дэпутаты Вярхоўнага Совета СССР вялікі правадыр народаў, друг працоўных БССР Іосіф Вісарыёнавіч Сталін, саратнікі правадыра прагрэсіўнага чалавецтва, сталінскія наркомы таварышы К. Е. Варашылаў і Н. І. Ежоў. На перадвыбарчых сходах работнікаў мастацтваў БССР, якія праходзяць у абстаноўцы вялікай палітычнай актыўнасці, усюды вылучаюць першым кандыдатам у дэпутаты генія мысляччага чалавецтва таварыша Сталіна.

Совецкая інтэлігенцыя, кроўна звязаная з рабочым класам і калгасным сялянствам, выхаваная партыяй Леніна—Сталіна, аддасць усе свае сілы і здольнасці вялікай справе—пабудове комунізма. Наша інтэлігенцыя не ведае жахаў беспрацоўя, галечы, голаду, яна не ведае здзекаў над чалавекам, калі ўсё жывое, усё здольнае мысліць душыцца фашызмам, як гэта мы наглядаем у сучаснай Германіі, Японіі, Італіі, Польшчы.

Наша совецкая інтэлігенцыя звязана ўсімі карэннямі з рабочым класам і сялянствам, служыць народу. Яна з'яўляецца роўнапраўным членам совецкага грамадства і разам з рабочымі і сялянамі, пад кіраўніцтвам комуністычнай партыі, вядзе будаўніцтва новага бяскласавага комуністычнага грамадства.

Саюз Советаў з'яўляецца перадавой, прагрэсіўнай краінай. Рабочы клас, сялянства, інтэлігенцыя, пад мудрым кіраўніцтвам І. В. Сталіна, прадаўжальніка вялікай справы Маркса—Энгельса—Леніна, пабудавалі соцыялізм. СССР—радзіма сусветнага пролетарыята. Саюз Советаў з'яўляецца высока развітай індустрыяльнай краінай. Нават пейзаж нашай краіны змяніўся. Мы яшчэ добра не ўсвядомілі ўсіх тых гіганцкіх змен, якія адбыліся ў нас.

«Мы ўсе—літаратары, рабочыя фабрык, калгаснікі—усё яшчэ дрэнна працуем і нават не можам цалкам зразумець усё тое, што створана намі і для нас. Наша працоўная маса ўсё яшчэ дрэнна разумее, што яна працуе толькі на сябе, для сябе. Гэта свядомасць усюды тлее, аднак яшчэ не запалала магутным і радасным агнём. Але нішто не можа запалаць раней чым дасягне пэўнай тэмпературы, і ніхто ніколі не ўмеў так дзівосна падвышаць тэмпературу працоўнай энергіі, як гэта ўмее рабіць партыя, арганізаваная геніем Владзіміра Леніна і сучасны нам правадыр гэтай партыі». (*М. Горкі*).

Сталінская Канстытуцыя, якая з'яўляецца падагульненнем пройдзенага слаўнага шляху рабочым класам СССР, сялянствам і інтэлігенцыяй, дзе амаль у пратакольнай форме запісаны нашы гіганцкія перамогі ў справе будаўніцтва соцыялізма, натхніла шырокія працоўныя масы на далейшую барацьбу, на ператварэнне ў жыццё вялікіх ідэй марксізма-ленінізма — пабудову комуністычнага грамадства.

Дванаццатага снежня ўпершыню ў гісторыі чалавецтва магутны совецкі народ будзе выбіраць самую дэмакратычную, сапраўды народную ўладу—Вярхоўны Совет СССР. Рабочы клас, сялянства і інтэлігенцыя прадэманструюць сваю аддана сць партыі Леніна—Сталіна. Яны выберуць першым дэпутатам таго чалавека, які высока падняў сцяг Маркса—Энгельса—Леніна, які прывёў нашу краіну да росквіту эканомікі і культуры, у якой знішчана ўсякая эксплаатацыя чалавека чалавекам. Яны выберуць першага з першых, які, не шкадуючы сваіх сіл, вядзе барацьбу за рабочую справу, бязлітасна знішчаючы ворагаў народа—трацкісцка-бухарынскае, нацыянал-фашысцкае і іншае атрэп'е, гэтых вырадкаў роду чалавечага, прадажных агентаў сусветнага фашызма, якія хацелі павярнуць кола гісторыі назад, рэстаўрыраваць у СССР капіталізм. Яны выберуць першым дэпутатам найвялікшага з вялікіх, паймудрэйшага з мудрых, чалавека з гарачым сэрцам, якое б'ецца на шчасце і радасць нашага народа, на шчасце і радасць усяго прыгнечанага чалавецтва свету,—*вялікага Сталіна*. Яны выберуць *Молатава, Варашылава, Калініна, Кагановіча, Ежова, Жданава*, выберуць бліжэйшых саратнікаў правадыра самых аўтарытэтных, самых папулярных людзей—комуністаў і беспартыйных, якія здольны выразіць волю народа.

Перадвыбарчыя сходы пісьменнікаў, работнікаў мастацтваў БССР паказалі, што гэта катэгорыя інтэлігенцыі значна палітычна вырасла. Сярод работнікаў мастацтваў першымі ідуць акторы нашых тэатраў, якія разгортваюць работу ў справе папулярызацыі Сталінскай Канстытуцыі, Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет СССР мастацкімі сродкамі. Аднак, трэба сказаць, што Упраўленне па справах мастацтваў пры СНК БССР не ўзначаліла падрыхтоўкі да выбараў. Нічога не робіць у гэтым напрамку і секцыя драматургаў ССПБ, якая павінна была арганізаваць работу па напісанню інтэрмедый, невялікіх п'ес, якія дапамагалі-б нашай партыі ў справе падрыхтоўкі да выбараў.

Надзвычай дрэнна пастаўлена работа Радыёкамітэта ў справе падрыхтоўкі да выбараў у Вярхоўны Совет СССР. Кіраўніцтва Радыёкамітэта ў асобе т. Гарачова усё яшчэ цягнецца ў хвасце мас, не здолела па-большэвіцку арганізаваць работу па падрыхтоўцы да выбараў, не ўзначаліла актыўнасці мас. Пераважная большасць радыёперадач, асабліва па мастацкаму сектару, не прадуманы, мастацкі недаапрацаваны.

Паранейшаму нічога не робіць Дом народнай творчасці ў справе падрыхтоўкі да выбараў у Вярхоўны Совет СССР. Кіраўніцтва ДНТ у асобе т. Рубенчык аказалася няздольным зразумець усю важнасць надыходзячай выбарчай кампаніі. Партыйная арганізацыя Упраўлення па справах мастацтваў пры СНК БССР павінна неадкладна заняцца работай ДНТ.

Дрэнна рыхтуецца да выбараў Тэатр оперы і балета (кіраўнік т. Ярыкаў), кансерваторыя (т. Гантман) і наогул усе нашы музычныя ўстановы. У нас сабраны багацейшы фальклорны матэрыял аб Сталінскай Канстытуцыі, аб правадыру працоўнага чалавецтва таварышу Сталіну, аб выбарах у Вярхоўны Совет, Усё гэта чакае выканання са сцэны нашымі спевакамі. Тт. Ярыкаў і Гантман павінны неадкладна арганізаваць гэту найвялікшай палітычнай важнасці работу.

Нельга думаць, што недабітыя рэшткі трацкісцка-бухарынскага, нацыянал-фашысцкага і іншага недабітага контррэволюцыйнага ахвосця не паспрабуюць шкодзіць нам у надыходзячых выбарах. Наша зброя—мастацкае слова—павінна быць адточаной.

Наш народ пад кіраўніцтвам комуністычнай партыі, пад кіраўніцтвам таварыша Сталіна, разаб'е ўшчэнт спробы ворагаў падарваць магутнасць нашай радзімы, выбера свой урад, які павядзе нашу краіну наперад да новых перамог.

Гераічны совецкі народ вылучыць кандыдатамі для галасавання ў дэпутаты Вярхоўнага Совета СССР лепшых людзей нашай краіны, лепшых сыноў нашай прыгожай радзімы.



«Чапаеў». Карціна Сварога. Фотарэпрадукцыя І. Каплінскага.

Пісьмо таварышу СТАЛІНУ

Дарагі Іосіф Вісарыёнавіч!

Рабочыя і работніцы, інжынеры і тэхнікі, байцы, камандзіры і палітработнікі, служачыя, работнікі навукі і мастацтва, усе працоўныя горада Менска на сваіх перадвыбарчых сходах з найвялікшым натхненнем і радасцю аднадушна грапанавалі Вашу кандыдатуру ў дэпутаты Совета Саюза ад Менскай гарадской выбарчай акругі.

Сёння, сабраўшыся на акруговую перадвыбарчую нараду Менскай выбарчай акругі БССР, мы прадстаўнікі агульных сходаў рабочых, служачых, вайсковых часцей, інжынерна-тэхнічных работнікаў прадпрыемстваў і ўстаноў, прадстаўнікі комуністычных арганізацый, прафесіянальных саюзаў, комсамола і таварыстваў працоўных, з найвялікшай радасцю і гордасцю падтрымалі прапанову працоўных Менскай гарадской выбарчай акругі і вылучылі Вашу кандыдатуру ў дэпутаты Совета Саюза ад нашай выбарчай акругі.

Працоўныя нашай выбарчай акругі лічаць сваім найвялікшым гонарам і шчасцем мець Вас сваім дэпутатам у Совет Саюза Вярхоўнага Совета СССР.

Грамадзяне нашай акругі з найвялікшым шчасцем і радасцю запішуць у выбарчы бюлетэнь сваім дэпутатам вялікае, слаўнае імя таго, хто забяспечыў нам шчаслівае і радаснае жыццё, хто з'яўляецца самым блізкім і любімейшым другам усяго народа нашага вялікага Саюза, хто перамoжна вёў і вядзе нас да поўнага трыумфа комунізма,—імя нашага роднага Сталіна.

Ад імя і па даручэнню 190 тысяч працоўных сталіцы ордэнаноснай БССР—Менскай гарадской выбарчай акругі, мы просім Вас, дарагі таварыш Сталін, даць сваю згоду балатыравацца ў Совет Саюза Вярхоўнага Совета СССР па Менскай гарадской выбарчай акрузе Беларускай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікі.

Няхай жыве наш любімы правадыр і настаўнік, самы блізкі і любімейшы друг таварыш Сталін!

По даручэнню акруговай нарады прадстаўнікоў прадпрыемстваў, вайсковых часцей, устаноў і грамадскіх арганізацый Менскай гарадской выбарчай акругі БССР падпісалі:

КАБЕРНІК — стаханаўка фабрыкі «8-е сакавіка», **ХВАШЧЭЎСКАЯ** — стаханаўка завода «Большэвік», **КРЫВАШЭЕЎ** — стаханавец завода імя Кірава, **СКАБЛО** — стаханавец фабрыкі імя Кагановіча, **ЛОСКАТ** — стаханавец завода імя Варашылава, **МАЦВЕЕЎ** — гарком КП(б)Б, **ПАПКОЎ** — старшыня акруговай выбарчай камісіі, **ДОЎНАР** — рабочы-стаханавец завода імя Варашылава, **ГЛЕБАЎ**—гарком комсамола, **ДАДЗІОМАВА** — Варашылаўскі горрайком КП(б)Б, **МІШКІН**—малодшы камандзір РСЧА, **СМОЛЕР**—Сталінскі горрайком КП(б)Б, **САВІЦКІ** — Кагановіцкі горрайком КП(б)Б, **ВАНЕЕЎ** — горсовет, **КІСЕЛЁЎ**—ваенны юрыст 1-га ранга, **КІЧА** — капітан.

Пісьмо таварышу ВАРАШЫЛАВУ

Дарагі Кліменцій Ефрэмавіч!

Мы сёння сабраліся на акруговую нараду прадстаўнікоў прадпрыемстваў, вайсковых часцей і грамадскіх арганізацый Менскай гарадской выбарчай акругі, на якой абмеркавалі пастанову агульных сходаў працоўных прадпрыемстваў і ўстаноў горада Менска, намеціўшых Вашу кандыдатуру ў дэпутаты Совета Саюза ад Менскай гарадской выбарчай акругі.

З пачуццём найвялікшай гордасці і радасці паведамляем Вас аб тым, што ўсе без выключэння сходы працоўных горада Менска вылучылі кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Совета ад Менскай выбарчай акругі вернага і бліжэйшага саратніка і друга вялікага Сталіна, мудрага дзяржаўнага дзеяча, жалезнага палкаводца першай у свеце Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі—Вас, дарагі Кліменцій Ефрэмавіч.

Кожны працоўны нашай выбарчай акругі, таксама як і ўсе працоўныя нашай вялікай совецкай радзімы, ведаюць Ваш слаўны жыццёвы шлях—шлях вернага сына вялікага совецкага народа.

Кожнаму працоўнаму Ваша імя вядома, як імя таго, хто разам з вялікім Сталіным ажыццяўляе кіраўніцтва пераможным будаўніцтвам соцыялізма ў нашай краіне і ўсёй сваёй нястомнай большэвіцкай энергіяй вядзе нашу краіну ад адной перамогі да другой.

Дарагі Кліменцій Ефрэмавіч, мы, прадстаўнікі прадпрыемстваў, вайсковых часцей, устаноў і грамадскіх арганізацый, па даручэнню 190 тысяч працоўных Менскай гарадской выбарчай акругі, просім Вас даць сваю згоду балатыравацца ў Совет Саюза Вярхоўнага Совета СССР па Менскай гарадской выбарчай акрузе БССР.

Працоўныя Менскай гарадской выбарчай акругі з найвялікшай радасцю і гордасцю аддадуць Вам свае галасы, сваё давер'е.

Няхай жыве жалезны нарком, верны саратнік вялікага Сталіна Кліменцій Ефрэмавіч Варашылаў!

По даручэнню акруговай нарады прадстаўнікоў прадпрыемстваў, вайсковых часцей, устаноў і грамадскіх арганізацый Менскай гарадской выбарчай акругі БССР падпісалі:

КАБЕРНІК — стаханаўка фабрыкі «8-е сакавіка», **ХВАШЧЭЎСКАЯ** — стаханаўка завода «Большэвік», **КРЫВАШЭЕЎ** — стаханавец завода імя Кірава, **СКАБЛО** — стаханавец фабрыкі імя Кагановіча, **ЛОСКАТ** — стаханавец завода імя Варашылава, **МАЦВЕЕЎ** — гарком КП(б)Б, **ПАПКОЎ** — старшыня акруговай выбарчай камісіі, **ДОЎНАР** — рабочы-стаханавец завода імя Варашылава, **ГЛЕБАЎ**—гарком комсамола, **ДАДЗІОМАВА** — Варашылаўскі горрайком КП(б)Б, **МІШКІН**—малодшы камандзір РСЧА, **СМОЛЕР**—Сталінскі горрайком КП(б)Б, **САВІЦКІ** — Кагановіцкі горрайком КП(б)Б, **ВАНЕЕЎ** — горсовет, **КІСЕЛЁЎ**—ваенны юрыст 1-га ранга, **КІЧА** — капітан.

Масква, Крэмль

Народнаму камісару унутраных спраў тав. ЕЖОВУ

ДАРАГІ НІКАЛАЙ ІВАНАВІЧ!

Агульны сход пісьменнікаў і супрацоўнікаў праўлення ССП БССР, сабраўшыся на свой перадвыбарчы сход, аднагалосна вылучыў сваім кандыдатам у Вярхоўны Совет Саюза ССР Вас, Нікалай Іванавіч, вернага вучня нашага геніяльнага правадыра таварыша Сталіна, як бясстрашнага наркома ўнутраных спраў.

Вы, таварыш Ежоў, адзін з любімейшых сыноў вялікай совецкай краіны, блізкі сэрцу беларускага народа. Жалезнай рукой вы грамілі і громіце зманіныя гнёзды трацкісцкай, бухарынскай і нацыянал-фашысцкай контррэволюцыі, выкурваючы ворагаў з усіх гнёзд. Пад Вашым кіраўніцтвам совецкая зямля, у тым ліку і Совецкая Беларусь, з поспехам ачышчаецца ад германа-японскіх і польскіх шпіёнаў і дыверсантаў. Беларускі народ не першы год ведае доблеснага сталінца, вернага сына нашай партыі т. Ежова.

Яшчэ ў годы грамадзянскай вайны Вы, Нікалай Іванавіч, нямала зрабілі для беларускага народа, адстойваючы яго самастойнасць ад нямецкіх і польскіх фашыстаў, умацоўваючы эканоміку, цэментуючы вакол Леніна і Сталіна рады КП(б)Б.


Вылучаючы Вас, таварыш Ежоў кандыдатам у Вярхоўны Совет СССР, мы просім даць сваю згоду балатыравацца па Менскай выбарчай акрузе.

Няхай жыве на многія годы наш правадыр Іосіф Вісарыёнавіч Сталін!

Няхай жыве верны вучань і паплечнік таварыша Сталіна Нікалай Іванавіч Ежоў.

По даручэнню агульнага схода—народны паэт рэспублікі **ЯНКА КУПАЛА**.

г. Менск.



Да 20-годдзя Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі Узбекскае Дзяржаўнае выдавецтва (Ташкент) выдае мастацкія плакаты.
На здымку: плакат работы мастака Чапракова.

Рэпрадукцыя М. Пенсона (Саюзфота).

ВЫСТАЎКА „БССР ЗА 20 ГОД"

З велізарнымі дасягненнямі прыходзіць беларускі народ да дваццацігоддзя Вялікай соцыялістычнай рэволюцыі. Аб гэтых дасягненнях, аб заваёвах беларускага народа пад кіраўніцтвам партыі Леніна—Сталіна за дваццаць год ва ўсіх галінах соцыялістычнага будаўніцтва раскажа вялікая выстаўка «БССР за 20 год», арганізуемая ўрадам нашай рэспублікі да 20-годдзя Кастрычніка.

У вялізных залах Дома ўрада размесцяцца экспанаты выстаўкі, якія пакажуць развіццё прамысловасці, сельскай гаспадаркі і культуры БССР.

У прамысловым аддзеле будуць прадстаўлены новыя галіны вытворчасці, якія не існавалі да рэволюцыі не толькі ў Беларусі, але і наогул у Расіі. Тут мы бачым, як БССР з сельскагаспадарчага края ператварылася ў індустрыяльна-аграрную рэспубліку. Будзе паказаны рад нанова пабудаваных прадпрыемстваў усесаюзнага значэння.

На выстаўцы шырока будзе адлюстрована перамога калгаснага ладу на вёсцы. Не пазнаць беларускіх вёсак, дзе панавала да рэволюцыі хвароба, бескультур'е, дзе сахой і драўлянай бараной калупалі зямлю. Вёска стала калгаснай, сяляне—заможнымі калгаснікамі. На калгасных палях працуюць трактары і волатыкамбайны. На наглядных прыкладах дзесяткаў калгасаў-мільянераў наведвальнікі выстаўкі ўбачаць, якім радасным стала жыццё ў совецкай краіне.

Вялікую цікавасць уяўляе сабой аддзел народнай асветы. Тут мы даведаемся, чаму вучыла старая школа і чаму вучыць наша совецкая школа. Наведвальнік убачыць, якія вялізныя сродкі ўкладае совецкая ўлада на асвету свайго народа. Шырока паказана і будаўніцтва сталінскіх школ. Совецкія дзеці займаюцца ў прасторных, добра абсталёваных, светлых школах. На выстаўцы багата прадстаўлена творчасць дзяцей—маляванне, лепка, літаратурныя творы, тэхнічныя вынаходніцтвы і інш.

Беларусь, якая не мела да рэволюцыі ні адной вышэйшай навучальнай установы, за дваццаць год свайго совецкага існавання пакрылася густой сеткай інстытутаў, вучылішчаў, школ, якія выхавалі тысячы совецкіх спецыялістаў, мае сваю Акадэмію навук, якая праводзіць вялікую даследчую работу як у галіне народнай гаспадаркі, так і ў галіне культуры.

Мова, якая царскім урадам забаранялася і праследвалася, расквітнела ў БССР. На беларускай мове зараз выдаецца палітычная, мастацкая і навуковая літаратура. На сваёй роднай мове беларускі народ чытае свае часопісы і газеты, якіх налічваецца ў БССР некалькі соцень. Расце і мацнее літаратура Совецкай Беларусі. Паказу творчага росту Саюза совецкіх пісьменнікаў БССР адведзены на выстаўцы самастойны аддзел.

У Доме Чырвонай Арміі размесціцца філіял выстаўкі, дзе будзе прадстаўлена выключна мастацтва. Тут будуць разгорнуты выстаўкі выяўленчага мастацтва, народнай творчасці, самадзейнасці, тэатра, кіно і інш.

Беларускі народ праяўляе вялікую цікавасць да выстаўкі і з нецярплівасцю чакае яе адкрыцця.

Выставачны камітэт парашыў адкрыць выстаўку 5 лістапада.

Дэкада совецкай музыкі

Совецкая музычная культура за дваццаць год рэволюцыі ўзнялася на незвычайную вышыню. Совецкія музыканты—пераможцы самых складаных міжнародных конкурсаў. Арганізуемая Камітэтам па справах мастацтваў пры СНК СССР дэкада совецкай музыкі, павінна прадэманстраваць перад совецкім народам вялізныя дасягненні совецкай музычнай культуры.

З 10 па 23 лістапада ў пяці гарадах Совецкага Саюза, у Маскве, Ленінградзе, Кіеве, Тбілісі і Менску будзе праходзіць дэкада совецкай музыкі.

10 лістапада ў Менску араторыяй «Пісьмо беларускага народа вялікаму Сталіну» адкрываецца дэкада совецкай музыкі. У выкананні гэтага вялікага мастацкага твору прымуць удзел усе калектывы Белдзяржфілармоніі, а таксама будуць удзельнічаць дзіцячы хор менскай музшколы і пагранічнікі. Араторыю ставяць акторы Тэатра оперы і балета Балоцін і Дзянісаў. Зараз кампазітары дапрацоўваюць сваю музыку, напісаную на тэкст «Пісьма». Над афармленнем сцэны працуе мастак Кіпніс.

У якасці чытальнікаў выступяць заслужаны артыст Владамірскі і артыстка Белдзярждрамтэатра Ржэцкая.

Філармонія мяркуе паказаць араторыю ў менскіх клубах, а магчыма—і ў буйнейшых калгасах і соўгасах, на фабрыках і заводах БССР.

Далейшы парадак вечароў дэкады наступны: канцэрт лепшых удзельнікаў 2-й усебеларускай алімпіяды мастацкай самадзейнасці, спектакль Бел. тэатра оперы і балета «Ціхі Дон», вечар камернай музыкі, вечар музыкі на абаронную тэматыку, вечар беларускага музычнага фальклора, канцэрт сімфанічнай музыкі (на канцэрт прыязджае кампазітар І. Дзяржынскі, творы якога будуць выконвацца аркестрам), праслухванне адной дзеі оперы Цікоцкага «Міхась Яноўскі», вечар музыкі народаў СССР.

Ва ўсіх гэтых канцэртах, вечарах і спектаклях прымуць удзел: Беларускі дзяржаўны тэатр оперы і балета, усе калектывы і салісты Белдзяржфілармоніі, вакальны ансамбль і секстэт домр Белрадыёкамітэта, музычныя навучальныя ўстановы Менска, чырвонаармейскі ансамбль песні і танца менскага Дома Чырвонай арміі, самадзейнасць гарнізона і пагранахоўы.

Святочныя канцэрты Белдзяржфілармоніі

29 і 30 кастрычніка Беларуская дзяржаўная філармонія дала два канцэрты беларускай музыкі.

Сімфанічны аркестр пад кіраўніцтвам дырыжора Мусіна выканаў «Капрычыо»—Аладава і «Фантазію» Туранкова, хор выканаў «Ой у лузе» (у апрацоўцы Любана»), «Ой на гары сухі дуб» (Копасава), «Лянок» (у апрацоўцы Туранкова), «Лявоніху», заключную частку «Пісьма беларускага народа вялікаму Сталіну» (Туранкова) і дзве песні, прэміраваныя на конкурсе «12 песень аб Чырвонай арміі»,—«Нашы хаты» Любана і «Калыханку» Іванова.

У рэпертуар ансамбля беларускай народнай песні і танца (які выступіць упершыню) і аркестра народных інструментаў уключаны песні і танцы беларускага народа.

У гэтых-жа двух канцэртах прымала ўдзел заслужаная артыстка БССР Л. Александроўская.

У дні свята Белдзяржфілармонія таксама абслужыць сваімі канцэртамі менскія фабрыкі і заводы.

Пісьменнікі рыхтуюцца да выбараў у Вярхоўны Совет СССР

Вялікага правадыра народаў таварыша СТАЛІНА, першага маршала Совецкага Саюза таварыша ВАРАШЫЛАВА, лепшага сталінца таварыша ЕЖОВА вызначылі пісьменнікі БССР кандыдатамі ў дэпутаты Вярхоўнага Совета СССР

НЕЗВЫЧАЙНЫ СХОД

26 кастрычніка адбыўся агульны сход комуністаў, комсамольцаў і беспартыйных совецкіх пісьменнікаў і работнікаў апарата Саюза совецкіх пісьменнікаў БССР. На сходзе прысутнічала 60 чалавек.

Гэта быў незвычайны сход. Совецкія беларускія пісьменнікі, як і ўвесь совецкі народ, сабраліся сення для вылучэння лепшых сыноў і дачок кандыдатамі ў дэпутаты Вярхоўнага Совета СССР. Усе народы Совецкага Саюза галасуюць сёння за адданых патрыётаў справы Леніна—Сталіна, за партыйных і непартыйных большэвікоў, якія аддаюць усё сваё жыццё і розум на справу социялізма, за перадавых людзей соцыялістычнага грамадства. Толькі шчаслівы совецкі народ мае поўныя дэмакратычныя правы і выбірае ў кіруючыя дзяржаўныя органы на аснове ўсеагульнага, роўнага і прамога выбарчага права пры тайным галасаванні.

Гэты сход быў дэманстрацыяй совецкага патрыятызма і адданасці сваім любімым правадырам і ў першую чаргу вялікаму Сталіну. І недарма ўспамінанне дарагога і блізкага імя таварыша Сталіна сустракалася дружнымі воплескамі.

Першай атрымала слова комсамолка-паэтэса Э. Агняцвет. Яна сказала:

— Мы сабраліся ў гістарычны час. Праз дванаццаць дзён мы будзем святкаваць 20-ю гадавіну Вялікай соцыялістычнай рэволюцыі, 12 снежня гэтага года мы будзем выбіраць лепшых людзей нашай краіны ў Вярхоўны Совет СССР. Мы дасягнулі вялікіх перамог, дзякуючы мудраму кіраўніцтву партыі Леніна—Сталіна, дзякуючы нашаму вялікаму Сталіну.

Самым дарагім імем для нас з'яўляецца імя вялікага, мудрага чалавека, правадыра, друга і настаўніка ўсіх працоўных таварыша Сталіна.

У гонар правадыра народаў усяго свету, любімага таварыша Сталіна усе прысутныя ўстаюць і наладжваюць доўгую авацыю.

— Іосіф Вісарыёнавіч Сталін,—працягвае тав. Агняцвет,—з самых юнацкіх гадоў аддае ўвесь свой геніяльны розум, усе свае вялікія сілы—справе працоўных, справе соцыялізма,—справе комунізма.

Разам з Леніным таварыш Сталін падрыхтаваў і арганізаваў перамогу соцыялістычнай рэволюцыі ў кастрычніку 1917 года.

У годы грамадзянскай вайны, калі над краінай звісалі чорныя хмары інтэрвенцыі, ён быў на самых цяжкіх, адказных франтах і там арганізоўваў перамогі.

Таварыш Сталін—вялікі друг беларускага народа, ён кіраваў барацьбой і перамогай беларускага народа над белапольскімі акупантамі. Сваю дзяржаўнасць Беларусь атрымала дзякуючы вялікаму Сталіну.

Таварыш Сталін першы дапамог беларускаму народу ўскрыць банду шпікаў і шкоднікаў, якія імкнуліся падарваць квітнеючае жыццё нашых калгаснікаў. Пад кіраўніцтвам вялікага Сталіна мы да канца ачысцім нашу свяшчэнную зямлю ад усякіх ворагаў народа: трацкісцка-бухарынска-зіноўеўскіх і нацдэмаўскіх вырадкаў, бандытаў, агідных агентаў фашызма.

Радасна жыць і тварыць пад ясным сонцам вялікай Сталінскай Канстытуцыі! Радасна жыць і тварыць у краіне квітнеючага соцыялізма, у краіне, якой кіруе вялікая партыя Леніна—Сталіна, якую вядзе да новых перамог вялікі правадыр усяго працоўнага чалавецтва таварыш Сталін. Таварыш Сталін даў нам прыгожае, радаснае, шчаслівае жыццё.

Я прапаную першым кандыдатам у Вярхоўны Совет СССР вылучыць Іосіфа Вісарыёнавіча Сталіна!

Прапанова тав. Агняцвет падтрымліваецца ўсімі прысутнымі доўганезмаўкаючымі апладысментамі.

Слова атрымлівае паэт П. Броўка. Ён з уздымам пачынае сваю прамову:

— Скора мы пойдзем да выбарчых урнаў. Мы будзем выбіраць тых, хто стварыў нам радаснае жыццё. Вялікі правадыр І. В. Сталін даў нам гэтае жыццё. Наша непераможная Рабоча-Сялянская Чырвоная Армія сваёю крывёю адстаяла нашу соцыялістычную святую зямлю. *(Апладысменты).*—Жалезны палкаводзец Клімецій Ефрэмавіч Варашылаў, пад кіраўніцтвам вялікага Леніна і Сталіна, выгнаў ворагаў з нашай радзімы. Жалезны палкаводзец Кліменцій Ефрэмавіч стаіць на варце нашых совецкіх граніц. І кожны вораг, які толькі папрабуе стаць на нашу зямлю, трапіць на пролетарскі штых.

Кліменцій Ефрэмавіч Варашылаў верны вучань і саратнік дарагога правадыра І. В. Сталіна, зброеносец вялікага і мужнага народа, верны вартаўнік соцыялізма.

Я прапаную вылучыць кандыдатам у Совет Саюза жалезнага палкаводца, народнага камісара абароны першага маршала Совецкага Саюза Кліменція Ефрэмавіча Варашылава.

Прысутныя ўстаюць і горача падтрымліваюць прапанову т. Броўкі, вітаюць сталінскага наркома, слаўнага совецкага палкаводца Кліменція Ефрэмавіча Варашылава працяглымі воплескамі.

— Сёння,—гаворыць крытык т. Кучар,—калі мы вылучаем лепшых прадстаўнікоў нашага народа ў Вярхоўны Совет Саюза ССР, нашы ўзрокі накіраваны да лепшага сталінца, які, падобна Феліксу Дзяржынскаму, трымае ў сваіх руках вострым меч пролетарскай дыктатуры,—да таварыша Нікалая Іванавіча Ежова *(Прысутныя стоячы ў гонар непахіснага чэкіста Н. І. Ежова наладжваюць авацыю).*

— Таварыш Ежоў,—працягвае т. Кучар,—ачышчае жалезнай рукой нашу краіну ад трацкісцкіх, бухарынскіх і нацыянал-фашысцкіх шпіёнаў і дыверсантаў. Таварыш Ежоў блізкі сэрцу беларускага народа. У дні грамадзянскай вайны ён абараняў самастойнасць Совецкай Беларусі, аднаўляў яе эканоміку, цэментаваў КП(б)Б вакол Леніна і Сталіна.

Вось чаму тав. Ежова Нікалая Іванавіча мы і павінны вылучыць у кандыдаты Вярхоўнага Совета СССР, як лепшага сталінца.

Прысутныя згаджаюцца з прапановай т. Кучара і вітаюць мечаносца рэволюцыйнай пільнасці Нікалая Іванавіча Ежова дружнымі апладысментамі.

Старэйшы беларускі пісьменнік таварыш Змітрок Бядуля досыць ярка расказаў аб сваім жыцці.

— Хачацца ўспомніць аб мінулым. Працоўны беларускі і яўрэйскі народ да Кастрычніка цярпелі страшны прыгнёт. Парабкі, бедныя сяляне былі цалкам залежны ад памешчыка. Панавала вялікая цемра, непісьменнасць была страшная. Па некаторых валасцях быў толькі адзін пісьменны чалавек—пісарчук. Беларускай літаратуры таго часу было вельмі мала, яе амаль зусім не было. Я. Купала і Я. Колас уяўлялі выключэнне. Народ тварыў сваю вусную літаратуру.

Пад кіраўніцтвам партыі Леніна—Сталіна змяніўся выгляд зямлі, усё жыццё: там дзе былі пустэчы—новыя заводы і фабрыкі, на балотах—новыя гарады. Сыны цёмнага ў мінулым народа сталі пісьменнікамі, вучонымі, пілотамі, інжынерамі.

Скажу пра сябе. Я пачаў пісаць з 1910 г. не маючы аніякай адукацыі. І да рэволюцыі я надрукаваў усяго адну кнігу, а пасля рэволюцыі выйшла да 20 маіх кніг.

Прыгнёт мінуўшчыны, пагромы, пазбаўленне выбарчых правоў яўрэяў я добра памятую.

Усё наша радаснае жыццё дала нам наша партыя. Нашы здабыткі замацаваў за намі наш правадыр. Я не памылюся, калі скажу, што за кандыдатуру таварыша Сталіна мы ўсе будзем галасаваць—усімі нашымі думкамі і пачуццямі.

Прысутныя ўстаюць і апладыруюць у гонар правадыра народаў таварыша Сталіна.

Потым з усхвалёванымі прамовамі выступалі і падзяліліся сваімі думкамі, якія ўсім сваім сэрцам выказаліся за вылучэнне вялікага правадыра таварыша Сталіна і сталінскіх наркомаў таварышоў Варашылава і Ежова ў кандыдаты Саюза Совета—тт. Клімковіч, Барысаў, Шарапаў і Фінкель.

Совецкія беларускія пісьменнікі і работнікі апарата Саюза совецкіх пісьменнікаў БССР аднагалосна пастанавілі вылучыць кандыдатамі ў Вярхоўны Совет СССР любімага правадыра таварыша Сталіна і сталінскіх наркомаў таварышоў Варашылава і Ежова. (Раздаюцца воклічы: «Няхай жывуць лепшыя людзі нашай радзімы, лепшыя кандыдаты ў Вярхоўны Совет ад нашай акругі таварышы Сталін, Варашылаў і Ежоў!», «Няхай жыве наша партыя!» Бурныя апладысменты. Воклічы «ура». Прысутныя з натхненнем выконваюць гімн працоўнага народа свету—«Інтэрнацыянал»).

Сход аднагалосна прымае тэксты тэлеграм таварышам Сталіну, Варашылаву і Ежову аб дазволе балатыравацца ў Менскай выбарчай акрузе. Сход пастанавіў паслаць тэлеграмы за подпісам народнага паэта Я. Купалы.

На акруговую нараду па выбарах ад ССПБ выбран тав. Лынькоў.



І. В. СТАЛІН

Скульптура самавучкі Б. М. Хрушчова (Бялыніцкі раён)—дрэва. З экспанатаў выстаўкі «БССР за 20 год».

Фотарэпрадукцыя І. Каплінскага.

РЭЗАЛЮЦЫЯ
агульнага схода пісьменнікаў БССР

Агульны сход пісьменнікаў горада Менска, абмеркаваўшы пытанне аб вылучэнні кандыдатур у дэпутаты Вярхоўнага Совета СССР па Менскай гарадской выбарчай акрузе, пастанаўляе:

Кандыдатамі ў дэпутаты Вярхоўнага Совета СССР па Менскай гарадской выбарчай акрузе вылучыць таго, хто вёў і вядзе нашу краіну ад перамогі да перамогі, хто забяспечыў працоўным нашай радзімы шчаслівае радаснае жыццё, пад чыім кіраўніцтвам разгромлены злейшыя ворагі народа—трацкісцка-бухарынскія і нацыянал-фашысцкія шпіёны, пад кіраўніцтвам якога наша краіна ператварылася ў магутную і неперамажную дзяржаву,—нашага любімага настаўніка і правадыра Іосіфа Вісарыёнавіча Сталіна.

Вылучыць таксама кандыдатамі ў дэпутаты лепшых сталінскіх саратнікаў, жалезных наркомаў—першага маршала СССР Кліменція Ефрэмавіча Варашылава і кіраўніка совецкай разведкі Нікалая Іванавіча Ежова.

Прасіць таварышаў Сталіна, Варашылава і Ежова даць згоду на балатыроўку ў Вярхоўны Совет па Менскай выбарчай акрузе.

Для адстойвання высунутых кандыдатур камандыраваць на акруговую нараду па намячэнню кандыдатур у Вярхоўны Совет тав. Лынькова.

К. Крапіва

ЖАЛЕЗНЫ МАРШАЛ

Агнём ён волю гартаваў,
Грудзьмі свабоду прыкрываў
Ад зграі чорных груганоў,
Граміў і будзе біць іх зноў
Ён, любы нам і страшны ім
Жалезны маршал родны Клім.

Спакойна сей, спакойна жні,
Даследуй ведаў глыбіні,
Працуй спакойна за станком:
На варце працы друг-нарком—
Ён, любы нам і страшны ім
Жалезны маршал родны Клім.

Пад спевы матчыны ў цішы
Спакойна спіце, малышы,
Салодкі ваш чароўны сон,
Ад ворагаў вартуе ён—
Ён, любы нам і страшны ім
Жалезны маршал родны Клім.

Хай толькі вораг нападзе,
Яму ні ў небе, ні ў вадзе
Не будзе літасці нідзе:
У люты бой нас павядзе
Ён, любы нам і страшны ім
Жалезны маршал родны Клім.

Саратнік Сталіна і друг,
Граза фашысцкіх псоў і слуг,
Нязломны ў працы і ў баю,—
Яму я голас аддаю:
Ён—любы нам і страшны ім
Жалезны маршал родны Клім.

АДЛЮСТРАВАЦЬ РАДАСНУЮ ПАДЗЕЮ ЭПОХІ

Гэты год, юбілейны для нашага совецкага народа і ўсяго перадавога чалавецтва, быў багаты знаменальнейшымі і хвалюючымі падзеямі, якія застануцца для гісторыі як велічныя помнікі Сталінскай эпохі. Шматлікія перамогі на франтах эканомікі і культуры, выдатныя дасягненні нашых слаўных лётчыкаў і вучоных, нашых артыстаў і мастакоў, хіба можна пералічыць усё, што адбылося ў нашай краіне за гэты год, колькі перажыта радасных, значнейшых падзей?

Цяпер краіна рыхтуецца да XX-годдзя Кастрычніка. Цяжка яшчэ зараз уявіць той грандыёзны размах святочнага энтузіязму ў прадчуванні якога жыве зараз усё навакол. Аднак, і цяпер ужо можна з упэўненасцю сказаць, што мы будзем удзельнікамі свята, якога не ведаў ні адзін народ на свеце. І ўсё-ж на гэтым не скончацца ўрачыстасці вялікага юбілейнага году. 12 снежня—вось дзень, што дастойна завяршае грандыёзны гістарычны этап, які прайшоў наш совецкі народ пад вадзіцельствам партыі Леніна—Сталіна на шляху да комунізма. Найвышэйшае дасягненне дэмакратыі, найвялікшая перамога совецкай улады—Сталінская Канстытуцыя дае права кожнаму з нас выбіраць і быць выбранаму ў Вярхоўны Совет Саюза, орган вышэйшай улады.

Свабодны грамадзянін нашай радзімы падыходзіць да выбарчай урны, каб аддаць свой голас лепшым людзям краіны—гэта ўрачысты акт. Гэтае права заваявана ва ўпартым змаганні ўсіх папярэдніх гадоў ад першых дзён грамадзянскай вайны да дзён шчаслівай сучаснасці. На гэтае права пасягалі нашы ворагі ўсіх масцей і гатункаў, пачынаючы ад белых генералаў і яснавельможных інтэрвентаў і канчаючы падонкамі чалавечага роду, прэзрэннай трацкісцка-зіноўеўскай, бухарынска-рыкаўскай, гестапаўскай агентурай. Гераічная Чырвоная Армія пад кіраўніцтвам першага маршала героя Варашылава скрышыла сілу белабандыцкіх і інтэрвенцкіх ордаў, разграміла і знішчыла іх да астатку. Нашы слаўныя чэкісты, пад кіраўніцтвам жалезнага наркома тав. Ежова выкрылі асноўныя варожыя гнёзды і выкарчоўваюць да канца рэшткі варожай нечысці з нашай свяшчэннай зямлі. Рукою вялікага Сталіна напісана Канстытуцыя СССР—вышэйшы закон, які ведае чалавецтва. Так, гэта ўрачысты хвалюючы, акт, калі совецкі грамадзянін, свабодны сын соцыялістычнай радзімы падыходзіць да выбарчай урны.

Наша задача—увекавечыць гэты акт. Творы нашых паэтаў, празаікаў, мастакоў, прысвечаныя вялікаму дню 12 снежня, павінны быць узорамі іх творчасці. Яны павінны адлюстраваць радасць і энтузіязм народа, яго любоў да вялікага нашага правадыра, адданасць народа ідэям партыі Леніна—Сталіна, згуртаванасць яго вакол партыі. Мы павінны паказаць ва ўсёй сіле знаменальнейшую падзею нашай эпохі, інакш мы не апраўдаем надзей, якія ўскладае народ на сваіх мастакоў.

Эдуард САМУЙЛЕНАК.

Свой голас аддаю правадырам народа

Старыя большэвікі, верныя саратнікі Леніна і Сталіна расказваюць, што калі ў дні перад Кастрычнікам адсутнічаў, прымушаны хавацца ад улады Керэнскага, таварыш Ленін, прамым праваднікам указанняў таварыша Леніна, яго надзей і чаканняў з'яўляўся таварыш Сталін. Не хто іншы як ён «кіраваў работаю VI з'езда комуністычнай партыі большэвікоў, бязлітасна разграміўшы нікчэмныя спробы капітулянства агідных каменевых, зіноўевых, і троцкіх.

Мы добра ведаем, што ні хто іншы, як тт. Ленін і Сталін з'яўляліся стваральнікамі Беларускай Совецкай Рэспублікі.

30 снежня 1918 года VI канферэнцыя большэвікоў Заходняга края, па ініцыятыве таварыша Сталіна, была ператворана ў першы з'езд комуністычнай партыі большэвікоў Беларусі. Беларусь упершыню за сваю гісторыю атрымала сваю дзяржаўнасць.

Я галасую за вялікага чалавека і правадыра нашай соцыялістычнай эпохі—за Іосіфа Вісарыёнавіча Сталіна.

Я галасую за таго, хто вызваліў беларускую зямлю ад белапанскай акупацыі; за таго, хто беражэ наша шчасце, радасць і працу, хто несакрушальнай бетаніраванай сцяной акружыў нашу зямлю,—за любімейшага маршала краіны, за жалезнага наркома абароны—Кліменція Ефрэмавіча Варашылава.

Я галасую за таго, чыё імя з'яўляецца гразой для ўсіх і ўсякіх ворагаў совецкага народа—для бандытаў-трацкістаў, бандытаў-бухарынцаў, бандытаў-нацыяналістаў; за таго, чый вобраз у казаннях беларускага народа ўвасоблены ў вобраз асілка нашай соцыялістычнай эпохі,—я галасую за Нікалая Іванавіча Ежова.

І мы пісьменнікі, мы працоўныя Совецкай Беларусі, самым гарачым словам, якое ідзе ад самага сэрца, будзем прасіць тт. Сталіна, Варашылава і Ежова даць сваю згоду балатыравацца па акругах нашай ордэнаноснай Беларусі.

АЛЕКСАНДР ШАРАПАЎ.

Зварот акруговай перадвыбарчай нарады да ўсіх выбаршчыкаў Менскай гарадской выбарчай акругі

Дарагія таварышы!

12 снежня совецкі народ будзе выбіраць вышэйшы орган соцыялістычнай дзяржавы рабочых і сялян—Вярхоўны Совет СССР на аснове абвешчанага Сталінскай Канстытуцыяй усеагульнага, прамога, роўнага выбарчага права пры тайным галасаванні.

У нашай Менскай выбарчай акрузе выбарчая кампанія пачалася.

Рабочыя і работніцы, інжынеры і тэхнікі, чырвонаармейцы, камандзіры, палітработнікі, служачыя на сваіх перадвыбарчых сходах вылучылі ў дэпутаты Совета Саюза кандыдатуры вялікага правадыра народаў Іосіфа Вісарыёнавіча Сталіна і яго бліжэйшага вернага саратніка жалезнага наркома абароны Кліменція Ефрэмавіча Варашылава.

Акруговая нарада прадстаўнікоў працоўных і часцей Чырвонай Арміі Менскай выбарчай акругі з пачуццём найвялікшай радасці і гордасці падтрымлівае ініцыятыву сходаў рабочых і служачых горада Менска, вылучыўшых у Совет Саюза кандыдатуры вялікага правадыра народаў таварыша Сталіна і жалезнага наркома абароны таварыша Варашылава, чые імёны хвалююць мільёны сэрцаў, клічуць на барацьбу працоўных і прыгнечаных у капіталістычных краінах, усяляюць у іх бадзёрасць і ўпэўненасць у перамозе, увасабляюць шчаслівае, радаснае жыццё народаў нашай совецкай радзімы.

Таварышы, вылучаючы слаўнейшых з кандыдатур, кандыдатуры вялікага правадыра народаў таварыша Сталіна і першага маршала Совецкага Саюза таварыша Варашылава, рабочыя і служачыя, байцы і камандзіры часцей РСЧА Менскай выбарчай акругі выразілі пачуццё ўсяго рабочага класа, усіх сялян, усіх народаў нашай краіны.

Абмяркоўваючы кандыдатуры творца Канстытуцыі таварыша Сталіна і яго вернага саратніка таварыша Варашылава ў дэпутаты Вярхоўнага Совета, кожны выступаўшы на сходах падводзіў вынік сусветна-гістарычных перамог соцыялізма ў нашай краіне, атрыманых пад кіраўніцтвам партыі Леніна—Сталіна, пад кіраўніцтвам мудрага правадыра народаў таварыша Сталіна.

З імем таварыша Сталіна непарыўна звязана гераічная барацьба і перамогі працоўных нашай краіны, якія прайшлі пад кіраўніцтвам партыі Леніна—Сталіна праз агонь вялікіх класавых баёў трох рэволюцый, праз франты грамадзянскай вайны, праз годы цяжкай разрухі, праз годы вялікага будаўніцтва соцыялізма.

Мы дасяглі гэтых сусветнагістарычных перамог соцыялізма таму, што на працягу ўсёй гісторыі слаўнай большэвіцкай партыі словы вялікіх правадыроў партыі і народа Леніна і Сталіна ніколі не разыходзіліся са справай.

Вось чаму на ўсіх перадвыбарчых сходах усе, як адзін, выбаршчыкі выражаюць сваё бязмежнае давер'е, сваю бязмежную любоў любімаму правадыру, настаўніку і другу працоўных Вялікаму Сталіну.

Вось чаму першым кандыдатам у дэпутаты Совета Саюза працоўныя нашай выбарчай акругі як і ўсёй нашай соцыялістычнай радзімы, называюць таварыша Сталіна, імя якога—сцяг вызваленай працы, высокай чалавечай годнасці, радаснага, шчаслівага жыцця народаў, якія ўпэўнена і смела ідуць наперад да комунізма.

З найвялікшай любоўю працоўныя нашай выбарчай акругі вылучаюць у дэпутаты Вярхоўнага Совета бліжэйшага вернага саратніка таварыша Сталіна—першага маршала Совецкага Саюза Кліменція Ефрэмавіча Варашылава.

Мы ўсе ведаем слаўны, гераічны жыццёвы шлях таварыша Варашылава, шлях непахіснага большэвіка-пролетарыя, прайшоўшага разам з Леніным і Сталіным і пад іх кіраўніцтвам праз агонь трох рэволюцый, заўсёды да канца адданага большэвіцкай партыі і ў першых яе радах заклікаўшага рускі рабочы клас на штурм капіталізма, выдатнага дзяржаўнага дзеяча і палкаводца, які пад кіраўніцтвам Леніна і таварыша Сталіна арганізаваў разгром белагвардзейскіх полчышчаў, аддае ўсю сваю большэвіцкую энергію для будаўніцтва і ўмацавання магутнасці нашай радзімы, для шчасця народаў.

Імя таварыша Варашылава ўвасабляе магутнасць самай моцнай, самай свядомай, першай у свеце Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі.

Імя слаўнага палкаводца Чырвонай Арміі са страхам і бяссільнай злосцю вымаўляецца ворагамі народа, гэта імя вымаўляецца з любоўю, гордасцю і надзеяй пролетарыямі і прыгнечанымі ўсяго свету.

Вось чаму з такім велізарным натхненнем усе працоўныя і часці Чырвонай Арміі сталіцы БССР вылучаюць сваім дэпутатам у Совет Саюза роднага Кліменція Ефрэмавіча Варашылава.

Нам, працоўным гор. Менска, як і ўсёй Совецкай Беларусі, асабліва родны і блізкі імёны любімага правадыра працоўных усяго свету таварыша Сталіна і жалезнага наркома абароны таварыша Варашылава, якія ў годы грамадзянскай вайны на чале рускага рабочага класа дапамаглі беларускаму народу ачысціць сваю зямлю ад германскіх і польскіх разбойніцкіх банд, ад памешчыкаў і капіталістаў.

Беларускі народ з найвялікшай удзячнасцю і любоўю вымаўляе імёны роднага правадыра, настаўніка і друга таварыша Сталіна і непахіснага сталінца, слаўнага палкаводца Чырвонай Арміі таварыша Варашылава, добра ведаючы іх штодзённую ўвагу і нястомныя клопаты аб росце і росквіце працоўных Совецкага Саюза, аб умацаванні БССР—баявога фарпоста Совецкага Саюза на заходніх граніцах.

Вось чаму працоўныя, чырвонаармейцы і камандзіры горада Менска ўсе свае галасы, усё сваё давер'е аддаюць лепшым з лепшых ленінцаў—мудраму правадыру народаў, роднаму таварышу Сталіну і яго бліжэйшаму саратніку і другу, неўстрашымаму барацьбіту за справу Леніна—Сталіна—таварышу Варашылаву.

Таварышы! 20 год над краінай Советаў горда рэе вялікі непераможны сцяг Маркса—Энгельса—Леніна—Сталіна, абвяшчаючы ўсяму свету аб новым грамадскім ладзе, дзе чалавек упэўнен у заўтрашнім дні, не ведаючы эксплаатацыі, беспрацоўя, жабрацтва і голаду.

Вогненымі літарамі Сталінскай Канстытуцыі начарталі народы краіны Советаў сусветна-гістарычныя перамогі соцыялізма ў СССР.

Нашы перамогі маглі-б быць нязмерна большымі, калі-б СССР не знаходзіўся ў капіталістычным акружэнні.

Фашысты—апошні аплот капіталізма— у сваёй злобнай нянавісці да першай у свеце соцыялістычнай дзяржавы засылаюць у нашу краіну шпіёнаў, дыверсантаў і шкоднікаў, скарыстоўваючы для сваіх гнусных мэтаў злейшых ворагаў народа—трацкістаў, бухарынцаў, буржуазных нацыяналістаў, нацыянал-фашыстаў, гэтых прэзрэнных здраднікаў нашай радзімы.

Для дасягнення сваіх подлых мэтаў яны шкодзілі на нашых прадпрыемствах, у калгасах, узрывалі і псавалі машыны, забівалі лепшых стаханаўцаў, прышчаплялі заразныя хваробы жывёле. Яны спадзяваліся аднавіць у нашай краіне ўладу памешчыкаў і капіталістаў.

Але ворагі пралічыліся. Пад кіраўніцтвам большэвіцкай партыі і асабіста таварыша Сталіна нашы слаўныя наркамунутдзельцы на чале са сталінскім наркомам таварышам Ежовым, пры актыўнай дапамозе ўсяго совецкага народа, разгромілі і выкарчоўваюць усіх фашысцкіх гадаў.

Няма і не будзе такой сілы ў свеце, якая здольна парушыць рух працоўных краіны Советаў наперад да комунізма.

Таварышы! Павысім рэволюцыйную пільнасць! Выкрыем, вытруцім з усіх нор і знішчым ворагаў народа, як шалёных сабак!

Наш совецкі ўрад і слаўны вартавы дыктатуры рабочага класа—НКВД на чале са сталінскім наркомам тав. Ежовым, выражаючы волю ўсяго совецкага народа, выкрывае ўсіх ворагаў, як-бы яны ні маскіраваліся, карае і будзе караць іх з усёй бязлітаснасцю, абараняючы інтарэсы і жыццё працоўных, абараняючы і ўмацоўваючы дзяржаву рабочых і сялян.

Таварышы рабочыя, работніцы, інжынеры і тэхнікі, чырвонаармейцы, камандзіры, палітработнікі, служачыя, работнікі навукі і культуры, хатнія гаспадыні, усе, што жывуць у Менскай гарадской выбарчай акрузе!

Мы заклікаем вас усіх удзельнічаць у выбарах дэпутатаў у Вярхоўны Совет СССР.

Аддадзім свае галасы за таварышоў Сталіна і Варашылава, у якіх няма іншых інтарэсаў, апрача інтарэсаў працоўных,—якія аддаюць усё сваё жыццё, усе свае сілы і энергію для шчасця працоўнага народа.

Няхай жыве наш родны і любімы правадыр працоўных усяго свету Іосіф Вісарыёнавіч Сталін!

Няхай жыве верны саратнік таварыша Сталіна жалезны нарком абароны Кліменцій Ефрэмавіч Варашылаў!

Няхай жыве вялікая партыя Леніна—Сталіна—арганізатар перамог соцыялізма ў нашай краіне!

Я выбіраю

Мы пойдзем 12-га снежня выбіраць у Вярхоўны Совет.

Гэтыя выбары—вынікі многіх выбараў, якімі мы даўно ўжо карыстаемся.

Мая краіна даўно дала мне права выбіраць куды я хачу пайсці вучыцца,—і я заняўся літаратурнай вучобай.

Мая краіна дала мне права выбіраць любую прафесію— і я абраў працу пачэсную, але не лёгкую—працу літаратара краіны Советаў.

І ўслед за гэтым краіна прапанавала мне любы выбар. Пазнай жыццё, малады пісьменнік, усе мае дарогі і неабсяжныя прасторы адкрыты перад табой. Жадаеш бачыць новы горад Магнітагорск, горад агню і сталі? Жадаеш паехаць на Данбас—да шахт і домнаў? Жадаеш паехаць на Днепрагэс—светач Украіны?

Я вельмі задаволены, што прыняў некаторы ўдзел у падрыхтоўчай прапагандысцкай рабоце да выбараў, працуючы разам з паэтам Аксельродам над інтэрмедыяй для яўрэйскага тэатра, на тэму аб выбарах.

Я задаволены, што буду разам з усім Саюзам совецкіх рэспублік галасаваць за далейшы росквіт краіны, за лепшых сыноў радзімы, за сапраўднае жыццё, створанае вялікім розумам Сталіна.

ЭЛЯ КАГАН.

КАСТРЫЧНІЦКІЯ СПЕКТАКЛІ



Беларускі Дзяржаўны дзіцячы тэатр рыхтуе да 20-годдзя Кастрычніка пастаноўку «Як гартавалася сталь» па раману Н. Астроўскага.
На здымку: рэпетыцыя сцэны «Правал» (II акт).
Фота І. Каплінскага.

„Самае дарагое ў чалавека...“

„Як гартавалася сталь“ у Дзяржаўным дзіцячым тэатры БССР

Таленавітая кніга Нікалая Астроўскага «Як гартавалася сталь»,—кніга аб пакаленні, узрошчаным соцыялістычнай рэволюцыяй, заслужана эрабілася любімейшай настольнай кнігай совецкай моладзі. Кожная старонка яе насычана вялікай жыццёвай праўдай, хвалюючай чытача, кожны паступак яе героя—Карчагіна перажыты ў свой час аўтарам кнігі.

Павел Карчагін, перш за ўсё, грамадзянін сваёй краіны, барацьбіт за справу соцыялізма. Сталінская эпоха стварыла Паўла Карчагіна.

Гэты вобраз тыпізуе лепшыя рысы людзей кастрычніцкага пакалення, тое новае, што нясе з сабой соцыялістычны чалавек. Павел Карчагін увасабляе ў сабе рысы і тэндэнцыі маладога чалавека нашай соцыялістычнай рэчаіснасці.

Інсцэніроўка рамана «Як гартавалася сталь»—справа надзвычай адказная і складаная. Вельмі цяжка перадаць усю глыбіню думкі, пачуццяў герояў рамана ў інсцэніроўцы.

Кожная інсцэніроўка нясе ў сябе некаторую схематычнасць, непаслядоўнасць развіцця падзей і т. д. Але прыступіўшы да работы над інсцэніроўкай тав. Юдэлевіча, дзе ўвесь упор узят на вобраз Паўла Карчагіна, мы імкнемся як мага праўдзівей і паўней адлюстраваць працэс станаўлення героя, які з бойкага, разумнага хлапчука ператвараецца ў выдатнага пісьменніка ордэнаносца. Апрача асноўнага героя, у інсцэніроўцы паказваецца моладзь, першыя комсамольцы, сям'я Карчагіных.

У рабоце з акторамі мы імкнемся стварыць праўдзівыя, рэалістычныя вобразы, выказваючыя думкі і пачуцці нашай совецкай моладзі.

Спектакль мы трактуем, як гераічную паэму пра доблесць і геройства нашай комуністычнай моладзі, якая мужна змагаецца за справу Вялікай пролетарскай рэволюцыі пад кіраўніцтвам партыі Леніна—Сталіна, як паэму пра рабочага хлопца, які становіцца героем свайго класа, героем сваёй рэволюцыйнай справы, прайшоў баявую школу большэвізма, у якім крок за крокам нараджаецца сур'ёзнасць і мужнасць пролетарскага байца.

«Яснасць мэты, настойлівасць у справе дасягнення мэты і цвёрдасць характару, ламаючыя ўсе і ўсякія перашкоды» *(Сталін)* — гэтыя рысы большэвіцкага характару мы імкнемся паказаць у вобразах спектакля. Мы імкнемся стварыць жыццесцвярджальны спектакль.

Жыццё—гэта барацьба. У гэтай барацьбе нараджаюцца і мацнеюць сапраўдныя героі—людзі з яркай індывідуальнасцю, з моцным характарам, людзі вялікіх страсцей і высокіх мысслей.

Баявы вобраз Паўла Карчагіна павінен выклікаць у нашага маладога гледача жаданне быць вартымі Паўла, які ўступае ў жыццё актыўным барацьбітом і астаецца ім да канца свайго жыцця. Бо:

«Самае дарагое ў чалавека—гэта жыццё. Яно даецца яму адзін раз і пражыць яго трэба так, каб не было пакутна, балюча за бязмэтна пражытыя годы, каб не пякла ганьба за подленькае і дробязнае мінулае і каб паміраючы змог сказаць: усё жыццё і ўсе сілы былі аддадзены самаму прыгожаму ў свеце—барацьбе за вызваленне чалавецтва».

Гэтай думкай павінен быць прасякнуты ўвесь спектакль.

У рабоце над спектаклем увесь калектыў тэатра заўсёды памятае словы Нікалая Астроўскага: «Няхай кожны таварыш, ад рэжысёра да рабочага—электраманцёра, паставіцца да гэтай справы з любоўю. Няхай маладыя артысты, якія будуць увасабляць у жыццё вобразы кнігі, глыбока прадумаюць свае ролі, каб шматмільённы глядач бачыў праўдзівыя, страсныя, парывістыя, бязмежна адданыя сваёй партыі вобразы першых комсамольцаў і старых большэвікоў часоў грамадзянскай вайны і наступных год».

Роль Паўла выконвае арт. Фрыдман, Рыты—арт. Гальперына, Жухрая—арт. Чэмялоў, Тоні—арт. Браварская, Валі Бруэжак—арт. Гурвіч, Сяргея—арт. Сівіцкі, музыкальнае афармленне спектакля кампазітара Падкавырава, мастак—Кіпніс. Пастаноўшчыкі спектакля заслужаны артыст рэспублікі Е. А. Міровіч і рэжысёр Ю. Г. Палічынецкі.

Е. МІРОВІЧ.
Ю. ПАЛІЧЫНЕЦКІ.

Да пастаноўкі „Сям'і Авадзіс“ у яўрэйскім Дзяржаўным тэатры БССР

П'еса «Сям'я Авадзіс» Пераца Маркіша трактуе праблему радзімы. Яўрэйскі народ пасля тысячагадовых вандраванняў набыў, нарэшце, радзіму. Гэта радзіма—СССР. Яўрэйскае аўтаномная вобласць цесна звязана ў п'есе з усёй краінай. Бірабіджан паказан, як фарпост СССР, як яго неад'емная частка. Нацыянальнае адраджэнне яўрэйскага народа непасрэдна звязана з абаронай заваёў Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі. Аўтар сцвярджае гэтае палажэнне на прыкладзе сям'і Авадзіс. Стары Заўл, галава сям'і выхаваў выдатных дзяцей. Яго сынамі ганарыцца совецкая краіна. Стары шчаслівы. Толькі адна акалічнасць яго засмучае. Шмат год назад яго сын—Шайка паехаў у Палясціну і пасяліўся там на чужыне. Заўл хоча, каб Шайка вярнуўся на радзіму ў СССР. Правільна робяць сыны старога, праяўляючы вялікую асцярожнасць у гэтым пытанні. Граніца моцна зачынена на замок. «Трэба ўмець абыходзіцца з ключамі ад гэтага замка,—гаворыць старому начальнік пагранзаставы Байко,—чужая краіна вам стала роднай, а родны сын вам стаў чужым».

Сямейныя ўстоі пераглядаюцца пад кутом гледжання інтарэсаў народа, інтарэсаў соцыялістычнай радзімы. Заўл Авадзіс, у пачатку некалькі засмучоны тым, што не ўся сям'я сабралася за яго сталом,—у рэзультаце ходу падзей прыходзіць да ўсведамлення, што шчасце сям'і вызначаецца безапаснасцю радзімы.

Совецкая сям'я не ёсць адасоблены, адгароджаны ад грамадства куточак, як у буржуазным свеце. Совецкая сям'я становіцца адным з асноўных звенняў, умацоўваючых і цэментуючых грамадскае і палітычнае жыццё краіны. А таму і маральныя асновы сям'і ў нас нічога агульнага не маюць з мяшчанскім эгацэнтрызмам—«мой дом—гэта пуп зямлі».

Шолэм-Алейхем вельмі ярка паказаў распад, разлажэнне яўрэйскай дробна буржуазнай сям'і ў п'есе «Цэзейт ун цэшпрэйт». Гэта Вавілон у мініацюры. Члены сям'і гавораць на розных мовах, адзін аднаго не разумее. Вузасць інтарэсаў. Дэгенератызм. Бацька Шалант вучыць дзяцей паказваць матцы фігі. У процівагу гэтаму ўспомнім совецкую сям'ю Кацельнікава—праобраз сям'і Авадзіс. На месца гераічна загінуўшага на граніцы брата становіцца яго малодшы брат. Нейкая асаблівая любоў бацькоў да дзяцей і дзяцей да бацькоў паказана ў п'есе Маркіша. Асаблівыя любоў і павага дзяцей да бацькоў маглі ўзнікнуць толькі на грунце новай, соцыялістычнай маралі. Гэта пачуццё ўзаемнай любові ўзмацняецца ад усведамлення, што сям'я мае моцную базу для квітнення—народ набыў сваю радзіму. Плытагон Авадзіс, які ў стары час марнеў, стаў знатным чалавекам вобласці. Ён перапісваецца з Калініным. Таварыш Варашылаў пасылае яму тэлеграму, у якой віншуе бацьку, выхаваўшага герояў-сыноў.

Авадзісы—патомственныя плытагоны. З малых гадоў яны выхоўваліся ў духу здаровых адносін да працы. У гэтых працаздольных і вынослівых людзей мараль не была скалечана купляй і продажам. Псіхіка не была здробнена неабходнасцю прыстасоўвацца, ізварачвацца і ашукваць. У рабоце над п'есай «Сям'я Авадзіс» тэатр паставіў перад сабой задачу стварыць цэльныя, соцыяльна здаровыя характары, не сапсаваныя старым местачковым і базарным бытам.

Нічога агульнага з героямі п'есы «Сям'я Авадзіс» не маюць традыцыйныя выхадцы з «гето»,—хваравітыя, маральна пакалечаныя, прышыбленыя яўрэі, якіх часта малявалі ў літаратуры ў якасці асноўных і быццам адзіных прадстаўнікоў яўрэйскага народа.

Ключом да разумення сутнасці герояў п'есы Маркіша з'яўляюцца словы тав. Калініна з яго прамовы «Аб стварэнні яўрэйскай аўтаномнай вобласці» (28 мая 1934 года, выданай асобнай брашурай ЦС. Азет,—горад Горкі, 1937 год).—«Я лічу, што біробіджанская яўрэйская нацыянальнасць не будзе нацыянальнасцю з рысамі местачковых яўрэяў Польшчы, Літвы, Беларусі, нават Украіны, таму што з яе выпрацоўваюцца зараз соцыялістычныя «каланізатары» вольнай, багатай зямлі з вялікімі кулакамі і моцнымі зубамі, якія будуць родапачынальнікамі абноўленай, моцнай нацыянальнасці ў складзе сям'і совецкіх народаў».

Рэжысёр В. ГАЛАЎЧЫНЕР.



«Сям'я Авадзіс» П. Маркіша ў Дзяржаўным яўрэйскім тэатры БССР.
На здымку: макет мастака Марыкса, I акт.
Фота Рывіна.



Яўрэйскі Дзяржаўны тэатр БССР у кастрычніцкія дні ставіць п'есу П. Маркіша «Сям'я Авадзіс».
На здымку: рэпетыцыя сцэны з II акта,—Сара Авадзіс—Ю. Арончык, Заул Авадзіс—М. Сокап.
Фота І. Каплінскага.

ЗАЎЛ АВАДЗІС

Да 20-й гадавіны Вялікага Кастрычніка наш тэатр рыхтуе п'есу П. Маркіша «Сям'я Авадзіс», дзе мне даручана цэнтральная роль Заўла. Гэта—60-гадовы стары плытагон у адным з калгасаў Бірабіджана. Ён поўны энергіі і жыцця. Адзін з сыноў Заўла, які знаходзіцца ў пагранічнай заставе, гіне ў сутычцы са шпіёнамі-японцамі, меўшымі намер перайсці нашую граніцу. Заўл сумуе, але не плача. Ён моцны, як дуб. Яго апанавала вялікая дума пра сына-героя, загінуўшага ў бойцы і не дапусціўшага ворагаў да нашай зямлі.

Заўл поўны вялікім пачуццем гордасці за сына, які аддаў сваё жыццё, як герой, за шчасце чалавецтва. Вось зараз яшчэ чуюцца Заўлу патэтычныя акорды мядзяных труб, велічна праважаўшых Шлёмку; яму не да рэлігійнага «кадэша» зараз. Заўл, вырваў сваё сэрца і паклаў яго на гэтую зямлю, каб яна стала роднай, сваёй, а Шлёмка загінуў за яе як герой! Дык няхай грае музыка!» Заўлу мярэшчыцца жывы сын Шлёмка, які сядзіць на кані і ад'язджае на граніцу. Ён выглядае, як Варашылаў. На ўцеху бацьку другі сын—Калмен—парашыў стаць на месца загінуўшага брата. Улюбёная Калмена ўжо пойдзе з ім на граніцу. Калмен усяляе ў сэрца Заўла новае пачуццё гордасці. Замест таго, каб павесці сына да шлюбу, ён павядзе яго на граніцу, дзе стаяў Шлёмка. Прыбывае віншуючая тэлеграма ад наркома тав. Варашылава—віншаванне з дзецьмі-героямі. Заўл узрушаны, і праважаючы сына з улюбёнай на граніцу ён гаворыць вясельны тост: «Мазл-тоф!»—«Віншую вас, дзеці!»

На маю долю выпала шчасце сыграць роль Заўла. Драматургічны і моўны матэрыял ролі даюць мне вялікія магчымасці накіраваць творчую фантазію ў бок паглыбленай прапрацоўкі ідэйнай, псіхалагічнай і эмацыянальнай лініі руху вобраза.

Асаблівыя труднасці ляжаць у шостай карціне («пасля пахавання»—адна з самых моцных сцэн п'есы). Лёгка ўпасці ў фальш і гэтым самым, пры неасцярожным падыходзе, парушыць стройную псіхалагічную лінію развіцця вобраза Заўла. Тут спатрэбілася крапатлівая, удумлівая і старанная прапрацоўка асобных кавалкаў, сказаў і «прадігры». Спатрэбілася падшукаць такія падтэксты, якія хвалявалі-б пачуцці, не парушаючы псіхалагічную лінію.

Працуючы з вялікім захапленнем над гэтым вобразам, перад мной праходзіць жыццё майго роднага бацькі, нястомнага працаўніка, які вельмі любіў сваіх дзяцей. Ад яго я вазьму для ролі цэлы рад гумарыстычных рыс. Вось ён стаіць ля паркана. Пагнаўся сабака за свіннёй. У вусах бацькі ўжо захавана ўсмешка. Зараз ён нешта раскажа і ўсё засмяюцца.

У сцэне атрымання віншавальнай тэлеграмы ад тав. Варашылава я распрацаваў гэтую дэталь наступным чынам. Заўл узрушаны і ўсхваляваны вялікім пачуццем, ён складае тэлеграму, зноў учытваецца ў яе, хавае ў бакавую кішэню, трэці раз, не знаходзячы месца для яе. Вочы глядзяць на начальніка пагранзаставы, ён ціскае яму руку і слёзы радасці блішчаць у вачах не плакаўшага ніколі да гэтага часу Заўла.

Роль запоўнена мною цэлым радам падрабязна распрацаваных дэталей ігравога псіхалагічнага плана.

Багацце матэрыялу, значэнне гэтага вобраза патройвае ў мяне пачуццё адказнасці перад рабочым гледачом і совецкай грамадскасцю.

Калі юнакі-гледачы пажадаюць, каб іх бацькі былі падобныя на Заўла, а гледачы-бацькі пажадаюць стаць такімі-ж, як Заўл, дык мая мэта будзе дасягнута.

М. Б. СОКАЛ, артыст Дзяржаўнага яўрэйскага тэатра БССР.

ВОБРАЗ ГЕРОЯ СТАЛІНСКАЙ ЭПОХІ

На маю долю выпала самая шчаслівая задача—выконваць ролю Паўла Карчагіна. Павел Карчагін, як вобраз на сцэне—гэта мара многіх маладых актораў. Такі вобраз стойкага байца, усёй душой адданага вялікай партыі большэвікоў магла нарадзіць толькі сталінская эпоха, эпоха перамогшага соцыялізма. Гэты вобраз са сцэны павінен клікаць нашу моладзь на вялікія подвігі ў імя нашай радзімы! «Усе сілы, усё жыццё аддаць самаму прыгожаму ў свеце,—барацьбе за вызваленне чалавецтва», вось сэнс ўсяго жыцця Паўла Карчагіна! Я хачу, каб мой Карчагін быў просты і даходлівы, каб яго справы і жыццё клікалі на барацьбу, на беззаветную адданасць ідэям партыі Леніна—Сталіна. Я вельмі многа працую, бо адчуваю вялікую адказнасць перад нашай грамадскасцю і маё адзінае жаданне—апраўдаць давер'е калектыва, які вызначыў мяне іграць ролю Паўла Карчагіна, лепшага прадстаўніка нашай гераічнай, шчаслівай моладзі.

Л. ФРЫДМАН.

31 X 1937 г.

В. Вольскі, А. Кучар

Беларуская совецкая літаратура за XX год

III

Беларускія нацыяналісты, ідэолагі контррэволюцыйнай буржуазіі, заўсёды былі заклятымі ворагамі народа. На ўсіх этапах барацьбы беларускіх працоўных мас за сваё соцыяльнае і нацыянальнае вызваленне яны нязменна выступалі як подлыя здраднікі радзімы, як прадажныя наймiты міжнароднага імперыялізма.

Яшчэ ў перыяд 1905 года беларускія буржуазныя нацыяналісты і іх прадстаўнікі ў літаратуры,—Жылуновіч (Ц. Гартны), Гарун, Ядвігін, Луцкевіч, Ігнатоўскі і інш., якія групаваліся вакол так званай «Беларускай Соцыялістычнай Грамады», паказалі перад працоўнымі масамі свой подлы і здрадніцкі твар. Выступаючы супроць рэволюцыйнага вырашэння аграрнага пытання і падтрымліваючы ў перыяд рэакцыі сталыпінскую хутарызацыю, яны ўсімі сіламі імкнуліся затрымаць рэволюцыйны ўздым беларускіх мас, прабуючы адцягнуць іх увагу ліберальнай балбатнёй аб абароне нібыта «агульнанацыянальных» інтарэсаў усяго беларускага народа. На справе-ж яны здраджвалі яго кроўным інтарэсам на карысць царскага самадзяржаўя.

Пасля паражэння рэволюцыі 1905 года яны стварылі свой уласны легальны орган друку, газету «Наша Ніва», якая адлюстроўвала інтарэсы беларускага кулацтва і растучай буржуазіі. Праз гэту газету, якая прапаведвала нацыянальнае «адраджэнне» Беларусі, «бяскласавасць» беларускай нацыі, рэакцыйную ідэалізацыю мінулага, нацыяналісты прабавалі ўздзейнічаць на творчасць такіх пісьменнікаў, як Янка Купала, Якуб Колас, Змітрок Бядуля, Максім Багдановіч і інш. у патрэбным ім кірунку. Трэба адзначыць, што пад уплывам нацыяналістаў Купала, Колас і Бядуля ў далейшым часта здавалі свае рэволюцыйна-дэмакратычныя пазіцыі і станавіліся на пункт гледжання нацыяналістаў. А к 1917 году нацыяналісты так аблыталі гэтых пісьменнікаў, што яны ў дні рашаючых баёў беларускага народа за сваю свабоду пайшлі не з народам, а з нацыяналістамі.

Купала, Колас і Бядуля не зразумелі значэння Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі. Не зразумелі яны і таго, што толькі пролетарская рэволюцыя прынесла беларускаму народу сапраўдную свабоду, бо толькі яна ўпершыню за ўвесь час яго гістарычнага існавання, пасля многіх стагоддзяў прыгнечання і гвалту, дала гэтаму народу дзяржаўнасць.

Не зразумеўшы гэтага, не разабраўшыся ў навакольных падзеях, яны не толькі асталіся абыякавымі да гераічных намаганняў беларускага народа адстаяць сваю незалежнасць, свае рэволюцыйныя заваяванні ад нямецкіх і белапольскіх акупантаў, але нават у рашаючыя моманты гэтай барацьбы праявілі ў сваёй літаратурнай і грамадскай дзейнасці варожыя адносіны да совецкай улады і да партыі большэвікоў.

К Кастрычніку 1917 г. беларускія буржуазныя нацыяналісты пераходзяць да актыўнай барацьбы супроць совецкай улады. Беларуская Соцыялістычная Грамада ператвараецца ў адкрытую контррэволюцыйную банду здраднікаў народа, якія прадавалі яго дзе толькі можна было.

Шуміха вакол нацыянальнай «самабытнасці», «незалежнасці», «абароны інтарэсаў нацыі» была для іх толькі маскіроўкай, адным з тактычных прыёмаў барацьбы супроць рэволюцыі.

У пошуках «гаспадара» буржуазныя нацыяналісты прабавалі зноў падняволіць беларускі народ, пазбавіць яго правоў, заваёваных рэволюцыяй. Вітаючы нямецкіх акупантаў, яны ў той-жа час па чарзе прабавалі прадаць сваю радзіму капіталістам Францыі, Англіі, Злучаных Штатаў Амерыкі.

Калі Пілсудскі, выконваючы дырэктывы Антанты, павёў у 1919 годзе свае легіёны супроць беларускіх рабочых і сялян і захапіў сталіцу Беларусі—Менск, ганебныя гандляры радзімай паспяшаліся наладзіць яму ўрачыстую сустрэчу. У асобе контррэволюцыйнага паэта і публіцыста «Нашай Нівы» А. Гаруна, які вітаў у Менску Пілсудскага ад імя «беларускай грамадскасці», беларускія буржуазныя нацыяналісты адкрыта засведчылі сваю адданасць інтарэсам польскага фашызма, агентурай якога яны з'яўляюцца і ў цяперашні час.

Прадажныя нацыяналістычныя газеткі «Звон», «Беларускае жыццё», якія выходзілі ў часе польскай акупацыі выяўлялі лакейскую адданасць акупантам. З нумара ў нумар імкнуліся яны ашукаць працоўныя масы, апраўдваючы рабаўнічую акупацыю, выхвальваючы панскую Польшчу. Вакол гэтых газет, якія выдаваліся на сродкі дэфензівы, згрупавалася ўся зграя контррэволюцыйных нацыяналістаў, пачынаючы ад Лёсіка і канчаючы іншымі ворагамі народа. На старонках «Звона» рассыпаўся Гарун у халуйскай адданасці перад Пілсудскім, польскія шпіёны друкавалі тут свае шавіністычныя вершы.

Гераічная Чырвоная Армія пры актыўным падтрыманні паўстаўшага беларускага народа ачысціла захопленыя тэрыторыі ад белапольскіх легіёнаў. Вызвалены Менск зноў робіцца сталіцай Совецкай Беларусі. Пад кіраўніцтвам комуністычнай партыі беларускі народ аднаўляе сваю гаспадарку, зруйнаваную імперыялістычнай вайной і варожымі акупацыямі.

Контррэволюцыйныя нацыяналісты і тут не складаюць зброі. Большасць з іх, канчаткова скампраметаваная ў вачах беларускага народа сваёй сувяззю з панскай Польшчай, сваёй здрадніцкай дзейнасцю на карысць акупантаў (у тым ліку і пісьменнікі тыпу Гаруна і Ядвігіна) эвакуявалася разам з польскімі войскамі, якія адступалі пад націскам Чырвонай Арміі і партызанскіх атрадаў.

Другая частка нацыяналістаў, уступае ў мэтах маскіроўкі ў створаную шпіёнам і правакатарам Ігнатоўскім, па заданню дыфензівы, так званую «Беларускую комуністычную арганізацыю», каб, астаўшыся на вызваленай тэрыторыі, прабрацца ў комуністычную партыю Беларусі і праводзіць у яе радах сваю шкодніцкую, дыверсанцкую работу.

Палітыка партыі і совецкай улады, накіраваная на ліквідацыю эканамічнай і культурнай адсталасці беларускага народа, дала скора, пасля таго, як былі выгнаны белапалякі, свае вынікі. Совецкая Беларусь уступае ў перыяд сапраўднага росквіту. Шырока разгортваецца культурнае будаўніцтва. Арганізуецца ўпершыню ў гісторыі Беларускі дзяржаўны тэатр. Ствараецца Дзяржаўнае выдавецтва. У велізарнай колькасці друкуюцца кнігі на беларускай мове. Беларуская мова робіцца моваю дзяржаўнай. Умовы, створаныя на Беларусі соцыялістычнай рэволюцыяй, спрыяюць вылучэнню новых дзесяткаў і соцень талентаў з глыбінь народных мас. Пачынаецца інтэнсіўнае развіццё совецкай мастацкай літаратуры. Вырастаюць новыя кадры беларускіх пісьменнікаў. Маладыя паэты—дзеці рабочых і сялян—апяваюць у сваіх творах, прасякнутых рэволюцыйным пафасам, гераічную барацьбу працоўных мас Беларусі супроць самадзяржаўя, супроць памешчыкаў і капіталістаў, супроць нямецкіх і польскіх акупантаў.

Перамога рэволюцыі ўдыхнула ў беларускую літаратуру новае жыццё, адкрыла перад ёю новыя перспектывы, пашырыла яе гарызонты, дала ёй новы кірунак. У песнях маладых беларускіх паэтаў загучэлі новыя мелодыі. Замест ранейшых традыцыйна-сумных, поўных тугі і роспачы матываў, уласцівых большасці дарэволюцыйных беларускіх пісьменнікаў, з'яўляюцца новыя песні, поўныя ўпэўненасці і жыццесцвярджальнай сілы. У гэтых песнях гучыць смелы заклік да барацьбы з ворагамі народа, да будаўніцтва новага соцыялістычнага жыцця. Асаблівага развіцця дасягае ў тыя часы рэволюцыйная лірыка, прасякнутая гневам і нянавісцю да ворагаў беларускага народа—белапольскіх акупантаў.

У 1922 годзе ўпершыню пачынае друкавацца малады сатырык Кандрат Крапіва. У 1923 годзе выступае са сваімі першымі вершамі паэт Паўлюк Трус. У 1924 годзе пачынае сваю творчую дзейнасць Кузьма Чорны. У 1926 годзе ўпершыню з'яўляюцца ў друку творы празаіка М. Лынькова і паэта П. Глебкі. Крыху пазней з'яўляюцца ў літаратуры паэт П. Броўка, празаік Р. Мурашка і шмат іншых.

Маладыя кадры беларускай совецкай літаратуры растуць ва ўмовах напружанай барацьбы з падрыўной, шкодніцкай дзейнасцю нацыяналістаў.

У мэтах большай канспірацыі і маскіроўкі нацыяналістычныя дыверсанты ў літаратуры стварылі знешнюю бачнасць «прынцыповых» творчых рознагалоссяў у сваім асяроддзі. Яны стварылі некалькі асобных літаратурных арганізацый, праводзячы ў іх аднолькава падрыўную контррэволюцыйную работу. Гэта была тактычная расстаноўка сіл, размеркаванне роляў, якое давала магчымасць нацыяналістычным шкоднікам ахопліваць сваім разлагаючым уплывам розныя групы літаратараў.

Па ініцыятыве аднаго з галоўных ідэолагаў беларускага нацыянал-фашызма, шпіёна Ігнатоўскага, было створана ў 1923 годзе літаратурнае аб'яднанне «Маладняк», у мэтах папярэдняй контррэволюцыйнай апрацоўкі літаратурнай моладзі. На чале гэтай арганізацыі быў пастаўлен былы супрацоўнік контррэволюцыйнага «Звона», польскі шпіён, які прабраўся ў комуністычную партыю і замаскаваўся, па ўказанню і пры дапамозе свайго кіраўніка Ігнатоўскага, «пад пролетарскага паэта».

Узначальваючы «Маладняк», ён сістэматычна праводзіў пры дапамозе Дудара, Зарэцкага, Дубоўкі і іншых выхаванцаў Ігнатоўскага, нацыяналістычную апрацоўку маладых літаратараў, вярбуючы сярод іх новыя кадры для контррэволюцыйнай работы.

У мэтах далейшага пашырэння сферы сваёй дзейнасці ў літаратуры нацыяналісты ствараюць у 1927 г., па водле ўказанняў таго-ж Ігнатоўскага новую літаратурную арганізацыю—«Узвышша». Ва «Узвышша» была вылучана група пісьменнікаў, якія прайшлі першапачатковую шавіністычную апрацоўку ў «Маладняку». У процілегласць «Маладняку», які праводзіў нацыяналістычную лінію больш ці менш замаскавана, прыкрываючыся «комсамольскай» шыльдай, «Узвышша» ў сваіх дэкларацыях адкрыта заявіла, што яно будзе праводзіць сваю дзейнасць пад кіраўніцтвам нацыянал-фашысцкай агентуры, якая прабралася ў рады компартыі. На старонках часопісу «Узвышша» друкаваліся адкрыта контррэволюцыйныя творы. Сваімі хлусліўымі лозунгамі барацьбы за «сапраўднае мастацтва», за «мастацтва, якое пабачаць вякі і народы» контррэволюцыйныя кіраўнікі «Узвышша», Дубоўка і інш., непасрэдна звязаныя з падпольнай нацыяналістычнай арганізацыяй, ашуканчым шляхам прыцягвалі ў свае рады асобных здольных, але палітычна недастаткова ўстойлівых, падвержаных нацыяналістычным хістанням, пісьменнікаў. Так, апрача З. Бядулі, ім удалося ўцягнуць у сваё аб'яднанне К. Крапіву, К. Чорнага, П. Глебку.

У мэтах адпаведнай апрацоўкі пісьменнікаў старэйшага пакалення контррэволюцыйнымі нацыяналістамі было створана ў 1928 годзе, літаратурнае аб'яднанне «Полымя». Сюды-ж увайшлі пакончыўшыя з сваімі функцыямі ў «Маладняку» яго ранейшыя арганізатары і кіраўнікі, разам з Александровічам. Адначасна з гэтым «Маладняк» уваходзіць у ВОАПП і пераіменоўваецца ў БелАПП.

Дэзарыентуючы, як і «Узвышша», сваімі дэкларацыямі асобных сумленных совецкіх пісьменнікаў, якія падаліся на вонкавую «саліднасць» аб'яднання, нацыяналісты з «Полымя», прыкрываючыся літаратурнымі імёнамі Купалы і Коласа, якія ўвайшлі ў аб'яднанне, і скарыстоўваючы іх нацыяналістычныя заблуджэнні, праводзілі тут такую-ж падрыўную, здрадніцкую работу, што і нацыяналісты за «Узвышшы», у «Маладняку», у «Пробліску», у «Літаратурна-мастацкай комуне». Усе гэтыя літаратурныя арганізацыі з'яўляліся ў аднолькавай ступені больш ці менш замаскаванымі ячэйкамі нацыяналістычнай контррэволюцыі.

З вонку «Маладняк» і «Узвышша» здаваліся арганізацыямі рэзка супроцьлеглага характару і кірунку. Па сутнасці-ж, фактычнымі, хоць і неафіцыйнымі, кіраўнікамі як «Маладняка», так і «Узвышша» і, у далейшым, «Полымя» на ўсім працягу іх існавання заставаліся, не гледзячы на ўяўнае вонкавае адрозненне ў творчых прынцыпах і кірунку гэтых арганізацый, адны і тыя-ж асобы—агенты польскага фашызма Ігнатоўскі, Адамовіч, і інш.

Імкнучыся прыбраць к рукам кіраўніцтва совецкай літаратурай, фашысцкі шпіён Адамовіч даваў непасрэдныя заказы асобным пісьменнікам. Так з'явілася, напрыклад, сатырычная паэма Александровіча «Цені на сонцы», у якой адна група нацыянал-фашыстаў зводзіла разлікі з другой групай, менш дзейнай і рашучай у сваёй падрыўной рабоце.

ПАМЯЦІ НЯБОЖЧЫКАЎ

(Пад Гётэ)

Сціпыліся Рапы,
Голасу ні-мі.
Шумныя Белапы
Поўны ціпыні.

Прытаіўся Бэнда,
Подбэндак уніх—
Марная гавэнда
І дарэмны крык.

Не шуршыць папера
Пад даклад пусты...
Пачакай, нявера,—
Аддыхнеш і ты!

Я. КОЛАС.

8/IV-1932 г.

Канцэрт беларускай музыкі

Усесаюзны Радыёкамітэт перыядычна транслірue канцэрты саюзных рэспублік для Далёкага Усходу.

5 лістапада транслірuецца чарговы канцэрт з БССР. У праграму ўключаны беларускія народныя песні ў выкананні баяніста Савіцкага, прыпеўкі аб заможным калгасным жыцці ў выкананні вакальнага ансамбля.

У канцэрце прымуць удзел калектывы Беларускай дзяржаўнай філармоніі. Аркестр народных інструментаў, пры ўдзеле салістаў Навіцкага і Шмелькіна, выканае беларускія танцы—«Лявоніху», «Юрачку», Крыжачок» пад акампанімент гэтага-ж аркестра заслужаная артыстка БССР Л. Александроўская выканае беларускія народныя песні «Замуж выйсці трэба знаць», «Янка», «Чаму-ж мне не пець», «Ох ці мне ох»; хор выканае беларускія народныя песні «Як крыніца цячэ», «Ой на гары сухі дуб» і іншыя.

„АНДРЭЙ І АЎГІННЯ“

24 кастрычніка ў памяшканні Дзяржаўнага беларускага тэатра оперы і балета адбылося праслуханне і абмеркаванне двух актаў (трох карцін) оперы «Андрэй і Аўгіння» маладога беларускага кампазітара Багатырова,—лібрэта Е. Рамановіча (па матывах аповесці Я. Коласа «Дрыгва»).

У абмеркаванні прынялі ўдзел кампазітары і работнікі тэатра—тт. Залатароў, Аладаў, Крошнер, Ярыкаў, Хайлаў, Штрыкуль, Шнейдэрман. Выступаючыя станоўча ацанілі работу аўтароў оперы аб партызанскім руху ў Беларусі.



Выдатны совецкі пісьменнік і актыўны грамадскі дзеяч Аляксей Нікалаевіч Талстой выпучаны кандыдатам ў дэпутаты Вярхоўнага Совета СССР.

На здымку: А. Н. Талстой у сваёй бібліятэцы.

Фота Р. Мазелева (Саюзфота).

Радыёфестываль Беларускай народнай творчасці

Вялікую гістарычную дату — 20-ю гадавіну Вялікай соцыялістычнай рэволюцыі Беларуская Совецкая Соцыялістычная Рэспубліка сустракае выдатнымі поспехамі, свежым прылівам творчай энергіі. Новыя песні пра шчаслівае жыццё складае совецкі народ. Новыя прыпеўкі, казкі, створаныя беларускім народам, напоўнены радасцю, энергіяй, бадзёрасцю, бязмежнай любоўю да сваёй соцыялістычнай радзімы. У гэтых песнях народ дзякуе натхніцелю сваіх перамог, вялікаму другу беларускага народа таварышу Сталіну, за бацькоўскія клопаты, за радаснае жыццё.

Беларускі радыёкамітэт у адзнаку 20-годдзя Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі з 1 па 25 кастрычніка правёў рэспубліканскі радыёфестываль народнай творчасці БССР. У радыёфестывалі прынялі ўдзел 30 раёнаў рэспублікі—каля трох тысяч чалавек.

Праз Менскую радыёстанцыю імя СНК БССР выступілі самыя рознастайныя калектывы і выканаўцы-адзіночкі мастацкай самадзейнасці. Тут калгасныя хоры, хоры фабрык і заводаў, клубаў, школ, струнныя і духавыя аркестры, ансамблі цымбалістаў, гармоністаў, жалеечнікі, дудары, сказіцелі, чытальнікі, спевакі, скрыпачы, мандаліністы, цэлыя музыкальныя сем'і, чырвонаармейскія ансамблі і т. д. Кожны калектыў, кожны асобны выканаўца сваім удзелам у радыёфестывалі рапартаваў аб сваім культурным росце за 20 год, росце, які стаў магчымым толькі ў нашай краіне, краіне перамогшага соцыялізма.

З сапраўдным майстэрствам выступіў хор работніц цагельнага завода г. Бабруйска. Хор складаецца з 9 дзяўчат, работніц гэтага завода. Яны выканалі тры рускія і дзве беларускія народныя песні. Асабліва добра, выразна прагучалі ў гэтага хора беларускія песні «У полі бярозка» і «Туды гара і сюды гара». Не меншую творчую ініцыятыву і вакальнае майстэрства паказалі два хоры Гомельскага раёна—хор Прыбыткоўскага сельсовета пад кіраўніцтвам калгасніка т. Пятрэнкі і хор соўгаса «Брылеў» пад кіраўніцтвам работніцы Дзякавай. Цяжка сказаць, які з гэтых двух хораў лепшы. Прыгожа прагучалі працяглыя беларускія песні «З радзімай старонушкі», «Сіня мора» у хора соўгаса «Брылеў»; хор Прыбыткоўскага сельсовета бадзёра, радасна выканаў плясавыя песні «Калінка-малінка», «Травушка муравушка» і прыпеўкі пра Сталіна. Гэтым-жа хорам была выканана песня «Пабраду я пабраду», запісаная ў 90-гадовай бабулі Варвары Пятрэнка.

У выступленні Бабруйска трэба адзначыць тт. Рабкіну, Годкіну, выконваўшых яўрэйскія народныя песні «Файфелах», «Мехутэ-нэстэ» і т. д., хор калгаса імя Калініна і калектыў пад кіраўніцтвам Сасуліна, паказаўшыя мантаж «Песні пра Царыцын».

У Рэчыцкім раёне да радыёфестывалю падрыхтаваўся хор калгаса імя Літвінава пад кіраўніцтвам 45-гадовай калгасніцы Тацяны Лапацінай Побач з выкананнем беларускіх народных песень, хор па-майстэрску з вялікім задорам выканаў частушкі з паэмы Кніпера «Пра байца-комсамольца». Вельмі цёпла і шчыра праспявала стаханаўка фанернага завода г. Рэчыцы т. Чыжык два рамансы Гурылева — «Матушка-голубушка» і «Колокольчики». Тав. Чыжык валодае добрым голасам, яна сталая ўдзельніца канцэртаў мастацкай самадзейнасці па радыё. Вельмі цікавым было выступленне трох музыкальных сем'яў. У Асіпавіцкім раёне выступіла сям'я рабочага шклянога завода «Кастрычнік» т. Пагодскага—бацька рабочы, дачка лабарантка, тры сыны—токар, вучань 9-га класа і вучань 5 класа. Яны выканалі рускія і беларускія песні. Неменш цікавым было выступленне сям'і 62-гадовага калгасніка калгаса «Герой працы» Лёзнянскага раёна тав. Марчанкі; калектыў гэты складаецца з бацькі калгасніка, трох сыноў і двух дачок. З сапраўднай радасцю прагучалі ў гэтай сям'і беларускія народныя танцы «Лявоніха», полька і рад рускіх песень. У Жыткавіцкім раёне выступіла сям'я калгасніка калгаса «Луч комуны» тав. Маліноўскага. У Жлобінскім раёне выступіў хор калгаса «Рассвет», Майскага сельсовета, пад кіраўніцтвам 60-гадовага калгасніка-стаханаўца тав. Герасімава. Добра таксама выступіў хор калгаса імя Леніна, Шклоўскага раёна, які выканаў дзве песні з «Пісьма беларускага народа вялікаму Сталіну»—«А там за Сулою» і «Пагранічная», а таксама рад беларускіх народных песень паслякастрычніцкага перыяду—«Сталін родны, бацька наш», «Як крыніца цячэ» і т. д.

Выключна шчыра, праўдзіва прагучала старадаўняя беларуская песня «Пастушок» у выкананні школьніка Хаскіна з Быхаўскага раёна.

Менск паказаў рознастайныя віды самадзейнасці. З вялікім уздымам хор рабочых-стаханаўцаў завода імя Варашылава пад кіраўніцтвам т. Разоўскай выканаў некалькі песень з «Пісьма беларускага народа вялікаму Сталіну»; «Стаханаўскім стала жыццё маладое», «Агні большэвіцкіх ідэй», а таксама беларускія народныя песні. З вялікім майстэрствам прачытала народную казку «Чалавек-сонца» работніца швейнай фабрыкі «Кастрычнік» Маруся Харык; выступілі таксама джаз гэтай фабрыкі, салісты, струнны аркестр Медінстытута і іншыя. 14 кастрычніка ў радыёфестывалі выступіла чырвонаармейская самадзейнасць—казацкі хор пад кіраўніцтвам тав. Дронава, ансамбль баявой чырвонаармейскай прыпеўкі пад кіраўніцтвам т. Маркіна, жонкі камандзіраў тт. Шылава, Папова, Аўдзеева і інш. Асабліва цікавым было выступленне ваеннага інжынера 2-га ранга т. Кулікава і малодшага камандзіра т. Астаф'ева, якія праспявалі волжскія і саратаўскія прыпеўкі. Вялікае ўхваленне ў журы атрымалі выступіўшыя ў радыёфестывалі 70-гадовы калгаснік калгаса «Армія Леніна» (Полацкі раён) т. Стэсь (ён выканаў на дудцы некалькі беларускіх народных песень) і 62-гадовы калгаснік калгаса «Перамога», Уздзеньскага раёна, Кастусь Чаглей. На травяной самадзельнай дудцы ён выканаў беларускую польку і песню «Ў полі вецер вее».

У выступленні Полацка трэба адзначыць аб'яднаны хор пяці калгасаў, добра выконваючы беларускія народныя песні, хор актывістак жонак стаханаўцаў і ІТР Полацка пад кіраўніцтвам т. Усачова, школьны аркестр пад кіраўніцтвам т. Шалаева.

Віцебск паказаў цікавы ансамбль у складзе трох цымбалістаў і трох скрыпачоў. У выкананні гэтага ансамбля слухачы пачулі беларускія танцавальныя мелодыі «Мікітка», «Кацярынка», «Агрэшыка», «Юрачка» і інш.

Добра выканаў рускую, беларускую, яўрэйскую і грузінскую песні хор фабрык «Сцяг індустрыялізацыі» г. Віцебска пад кіраўніцтвам т. Фірта. Асабліва добра выканаў гэты хор «Песню пра Сталіна».

Галіна Гусарэвіч (чыгуначны клуб імя Леніна) вельмі добра праспявала арыю Лізы з оперы Чайкоўскага «Пікавая дама» і песню беларускага совецкага кампазітара Туранкова «Кастрычніцкая калгасная».

Выступленнем 4-х раёнаў—Уздзеньскага, Чырвонапольскага, Бялыніцкага і Гарадокскага—закончыўся рэспубліканскі радыёфестываль народнай творчасці.

Сапраўднае майстэрства ў выкананні беларускіх народных песень паказалі тры народныя калгасныя хоры Чырвонапольскага раёна з калгасаў «Новы свет», «Хваля рэволюцыі» і «Полымя». Хоры праспявалі самыя рознастайныя беларускія народныя песні.

Журы фестываля высунула да прэміі наступныя калектывы і выканаўцаў адзіночак: жаночы ансамбль работніц Бабруйскага цагельнага завода, хор пад кіраўніцтвам Сасуліна (Бабруйск), хор Прыбыткоўскага сельсовета і соўгаса «Брылеў», Гомельскага раёна, рабочы хор завода імя Варашылава (Менск), казацкі хор пад кіраўніцтвам Дронава, хор калгаса «Полымя» Заслаўскага раёна, хор калгасаў імя Леніна і «Пражэктар» Шклоўскага раёна, хор пад кіраўніцтвам Усачова (Полацк), хор чыгуначнага клуба імя Леніна (Гомель), аб'яднаны хор пяці калгасаў Полацкага раёна, хор клуба дзяржгандлю (Віцебск), тры калгасныя хоры Чырвонапольскага раёна, хор калгаса «Рассвет», струнны аркестр пад кіраўніцтвам Шалаева (Полацк), хор баявой чырвонаармейскай частушкі, джаз фабрыкі «Кастрычнік» (Менск), ансамблі цымбалістаў (Гомель і Вецебск), сям'ю калгасніка Марчанкі, тт. Гусарэвіч (Віцебск), Марусю Харык (Менск), Хаскіна (Быхаў), Рабкіну (Бабруйск), Стэсь (Полацк), Кастуся Чаглей (Узда), Кулікова і Астаф'ева (Менск) і інш.

У фестывалі прынялі ўдзел і прафесіянальныя сілы БССР. Лепшыя ўдзельнікі фестываля былі выкліканы ў Менск для ўдзелу 30 кастрычніка ў канцэрце для Масквы праз станцыю імя Комінтэрна.

Радыёфестываль выклікаў шмат водгукаў ад радыёслухачоў не толькі Беларусі, але з Масквы і Украіны.

Радыёфестываль беларускай народнай творчасці паказаў, што да 20-гадавіны Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі ў Беларускай Совецкай Соцыялістычнай Рэспубліцы, таксама як і ва ўсіх рэспубліках, ва ўсіх вёсках і гарадах нашай неабсяжнай радзімы, народ складае і спявае новыя песні, у якіх славіць свае перамогі, сваё шчаслівае жыццё, любімага правадыра і друга Вялікага Сталіна.

Р. А.



«Калгасны пісьманосец». Карціна мастака-самавучкі Дашынскага (Віцебск).

Фотарэпрадукцыя І. Каплінскага.



Частка макета станцыі маскоўскага метро «Плошча Рэволюцыі». Праект архітэктара Душкіна, скульптурнае афармленне заслужанага дзеяча мастацтваў Л. Манізера.

Фота Л. Вялікжаніна (Саюзфота).

ЛЕНІНГРАДСКІЯ НАВІНЫ МАСТАЦТВА

Тэатр мініацюр

У Ленінградзе арганізован першы і пакуль адзіны ў Саюзе Тэатр мініацюр. Мастацкім кіраўніком новага тэатра прызначаны заслужаны дзеяч мастацтва кампазітар-ордэнаносец Ісак Дунаеўскі. Тэатру прадастаўлена былое памяшканне Мюзік-Хола.

Вось што расказвае І. Дунаеўскі аб прызначэнні і праграме новага тэатра.

— Тэатр мініацюр—палітычны тэатр, які абавязан хутка адгукацца на самыя актуальныя тэмы, нараджаемыя нашым кіпучым жыццём. Зараз наш тэатр жыве двума велізарнымі падзеямі бягучага часу — падрыхтоўкай да выбараў у Вярхоўны Совет і надыходзячай XX гадавіны Вялікага Кастрычніка. Гэтыя дзве падзеі, якія хвалююць кожнага совецкага грамадзяніна, знайшлі сваё адлюстраванне ў нашай першай праграме. У радзе невялікіх драматычных і музычных рэчаў закрануты пытанні абароны, пільнасці. Невялікая сцэнка паказвае цягу нашых дзяўчат на Далёкі Ўсход. Сярод гераічных песень цэнтральнае месца займае «Песня пра Сталіна». З фальклора ў першую праграму ўвайшлі абаяльныя карэльскія танцы.

Пры тэатры—танцавальны і вакальны ансамблі. Арганізован таксама новы джаз-аркестр. У трупу тэатра ўвайшлі выдатныя ленінградскія акторы: заслуж. арт. Е. М. Граноўская, артысты Ардзі, Казарынаў, Уральскі, Менакер і інш. Рэжысёрамі запрошаны Д. Г. Гутман, Мейсель і Лебедзеў.

Апрача ленінградскіх драматургаў і кампазітараў, да работы ў тэатр прыцягнуты масквічы, у прыватнасці, пісьменнікі Бабель, Катаеў, Нікулін, Ардаў.

Для абслугоўвання выбарчай кампаніі арганізуюцца спецыяльныя брыгады з спецыяльным рэпертуарам.

Юбілейная выстаўка ў Рускім музеі

Каля 300 ленінградскіх мастакоў выстаўляць свае работы на выстаўцы выяўленчага мастацтва, якая арганізуецца Рускім музеем у гонар XX-годдзя Кастрычніка.

Вось далёка не поўны пералік новых карцін, што трактуюць тэмы соцыялістычнага патрыятызма, абароны радзімы, тэмы Сталінскай Канстытуцыі, гісторыі большэвіцкай партыі, гісторыі грамадзянскай вайны: «VI з'езд партыі» мастака А. Любімага, «Абарона Царыцына» і «Узяцце Зімняга» (новы варыянт) мастака Р. Франца, «Пагранічнікі» М. Авілава, «Кіраў на фізкультурным парадзе» А. Самахвалава, «Сталін ля труны Кірава» мастака Руткоўскага, «Разгром Юдзеніча пад Петраградам» Н. Качэргіна.

Скульптары Дыдыкін, Гаспаран, Сімонаў, Элонен закончылі рад скульптур таварышаў Сталіна, Молатава, Варашылава, Серго Орджанікідзе і інш.

Выдатныя дзеячы мастацтва і літаратуры—члены акруговых выбарчых камісій

У спісках акруговых выбарчых камісій гор. Ленінграда побач з прадстаўнікамі буйнейшых заводаў Ленінграда, побач з прадстаўнікамі прафсаюзаў, Асоавіяхіма, партыйных арганізацый,—красуюцца імёны артыстаў, мастакоў, пісьменнікаў.

Членам акруговай выбарчай камісіі Прыморскай акругі зацверджан Мацвей Генрыхавіч Манізер—заслужаны дзеяч мастацтваў, выдатны скульптар, аўтар помніка Леніну ля Фінляндскага вакзала ў Ленінградзе, помніка Т. Шаўчэнку ў Харкаве, помніка Леніну ў Менску каля Дома Ўрада.

Сярод членаў выбарчай камісіі Свярдлоўскай акругі мы бачым імя Нікалая Канстанцінавіча Чаркасава—незабыўнага прафесара Палетаева з фільма «Дэпутат Балтыкі».

Выдатны оперны артыст Барыс Мацвеевіч Фрэйдкоў увайшоў у склад выбарчай камісіі Октябрскай акругі. Міхаіл Міхайлавіч Зошчанка (Фрунзенская выбарчая акруга), паэт Аляксандр Андрэевіч Пракоф'еў (Кіраўская выбарчая акруга), Аляксей Нікалаевіч Талстой і народная артыстка Саюза ССР Карчагіна—Александроўская Екацярына Паўлаўна (Кіраўская выбарчая акруга), Ісак Іосіфавіч Дунаеўскі, архітэктар Аляксандр Іванавіч Гегелло. Такі спісак работнікаў мастацтва, якія заслужылі высокі гонар быць у акруговых выбарчых камісіях горада Леніна.

А. МАІСЕЕЎ.

Папраўка

У мінулым нумары нашай газеты ў артыкуле В. Вольскага і А. Кучара «Беларуская совецкая літаратура за 20 год» у чацвертай калонцы у трэцім абзацы зверху трэба чытаць: «Максім Багдановіч—паэт сімваліст, які не мала зрабіў для фармальнай дасканаласці беларускай літаратуры».

М. А. Керзін

Да гісторыі выяўленчага мастацтва БССР

II

Вялікая Кастрычніцкая соцыялістычная рэволюцыя падняла да жыцця прыгнечаныя масы. Па ўсёй краіне, аж да самых аддаленых мядзвежых куткоў, жыццё забіла бурнай крыніцай. Рабочы клас у саюзе з бяднейшым сялянствам, пад кіраўніцтвам партыі Леніна—Сталіна, у цяжкай напружанай абстаноўцы грамадзянскай вайны, гаспадарчай разрухі, прыступіў да будаўніцтва соцыялізма, надаючы ў гэтым будаўніцтве задачам культуры велізарнейшае значэнне.

У Беларусі цэнтрам культурнага будаўніцтва на час з 1918 па 1921 год робіцца Віцебск. Тут адкрываецца цэлы рад вышэйшых і сярэдніх навучальных устаноў—народны універсітэт, сельскагаспадарчы інстытут, механічны тэхнікум, кансерваторыя, мастацка-практычны інстытут, арганізуецца дзейнасць мастацкіх і навуковых устаноў. Сюды па запрашэнню ГубАНА, а часткова і па сваёй ініцыятыве з сталічных гарадоў Масквы і Петраграда прыязджаюць работнікі розных галін ведаў і мастацтва. Сярод іх шмат выдатных імён.

Тэатр, дзе працуе сталая трупа, у склад якой уваходзяць вядомыя артысты, сімфанічныя канцэрты пад кіраўніцтвам буйнага дырыжора Малько, дыспуты, лекцыі, перыядычныя часопісы і выданні, прысвечаныя пытанням мастацтва—ствараюць небывалае, немыслімае год назад, напружанае, часам сумбурна-напружанае жыццё мастацтва.

Каб правільна зразумець тое, што адбывалася на выяўленчым фронце ў першыя годы рэволюцыі, трэба ўспомніць, у якім становішчы застала рэволюцыя выяўленчае мастацтва ў Расіі.

Трэба хоць у самых сціслых рысах прыгадаць аб галоўных дзеючых асобах перадрэволюцыйнага перыяду ў рускім мастацтве.

Пануючае становішча займалі «передвижники», якія з'яўляліся хавальнікамі традыцый рэалістычнага мастацтва. Але гэта ўжо не былі «передвижники» 70—80 гг. Ідэйны змест тых «передвижников» быў зжыты, а новага яны не набылі. Лозунг «мастацтва па-за палітыкай» быў імі цалкам прыняты і пад гэтым лозунгам яны выхоўвалі маладыя кадры ў Акадэміі мастацтваў. Напружаную барацьбу за вядучую ролю з імі вёў «Мир искусства», які з'яўляўся найбольш яркім выразнікам густаў і ідэалагічных установак у галіне мастацтва буйнай буржуазіі. Яго лозунгам было «мастацтва для мастацтва». Гэта была ўстаноўка на голы эстэтызм і прытым эстэтызм эпохі заняпаду капіталізма. «Мир искусства» стаяў на глебе крайняга індывідуалізма, адмаўляючы пераважаючае значэнне не толькі зместу, але і таго ці іншага напрамку ў мастацтве. На яго выстаўках знаходзілі сабе прытулак амаль усе фармалістычныя плыні, аж да кубізма і футурызма; ён ставіў мастаку толькі адно патрабаванне—яркасць і індывідуальнасць выражэння.

Утончаныя і перасычаныя густы патрабавалі незвычайнага, кур'ёзнага, «прыгажосці ў агіднасці». Часткова ў якасці такіх кур'ёзаў на выстаўкі «Мир искусства» і дапускаліся выбраныя прадстаўнікі кубізма і футурызма. «Мир искусства» ў іх шукаў саюзнікаў у барацьбе супроць «передвижников». Але за гэтымі выбранымі была значная група фармалістычнай багемы, якая менш за ўсё жадала быць прадметам забавы. Па сваёй сутнасці яна ўяўляла сабой тую групу, якую Владзімір Ільіч Ленін геніяльна вызначыў: «Шалёныя дробныя буржуа». Партыя заклікала ўсіх майстроў мастацтва працаваць на карысць новага соцыялістычнага грамадства, даўшы з першых-жа дзён установку на мастацтва, зразумелае шырокім масам, рэволюцыйнае па зместу.

У сілу цэлага раду гістарычных прычын у першыя дні рэволюцыі аказаліся найбольш актыўнымі іменна мастакі, належачыя да фармалістычных і крайне-фармалістычных напрамкаў. Аднак, было-б памылковым думаць, што адначасна з імі не працавалі і мастакі-рэалісты, форма якіх была значна больш зразумелай шырокім рабочым масам. Фармалісты на вельмі кароткі час занялі перадавыя пазіцыі. Іх сапраўдны твар, глыбока варожы рабочай масе, па сутнасці контррэволюцыйны, яны маскіравалі рэволюцыйнай фразеалогіяй. У працэсе іх дзейнасці твар гэты быў хутка выкрыты, і да іх у поўнай меры могуць быць аднесены словы вядомага афарызма, ужытага В. І. Леніным да левых эсэраў: «Была без радости любовь, разлука будет без печали».

Аднак, вернемся да храналогіі падзей. У самым пачатку 1918 года ў свой родны горад Віцебск прыехаў мастак Марк Шагал, прызначаны А. В. Луначарскім на пасаду губернскага камісара па справах мастацтваў. Неўзабаве была арганізавана народная мастацкая школа, у 1920 годзе рэарганізаваная ў мастацка-практычны інстытут. Дырэктарам гэтай школы быў запрошан вядомы ўдзельнік выставак «Мира искусства» мастак М. Дабужынскі, выкладчыкамі былі мастакі: Марк Шагал, Фальк, Кован, скульптар Я. Керсон, некалькі пазней—Малевіч, Лісіцкі, Пунін, Ермалаева і іншыя. Усе яны называлі сябе прадстаўнікамі левых напрамкаў, а па-сутнасці былі крайнімі фармалістамі. Адзін толькі М. Дабужынскі валодаў рэальнай формай, але па сваіх «мирискусственнических» установках, наогул адмаўляўшых значэнне і змест у мастацтве, яго ніяк нельга было назваць рэалістам у тым сэнсе слова, як мы яго разумеем. Прапрацаваўшы ў Віцебску менш года, ён паехаў. Памяць аб яго знаходжанні ў Віцебску захавалася ў выглядзе некалькіх эцюдаў і карціны, якія паказваюць віды Віцебска. Карціна ў сучасны момант знаходзіцца ў Музеі рускай жывапісі ў Ленінградзе. Пасля Дабужынскага дырэктарам мастацка-практычнага інстытута стаў Марк Шагал. Ідэалогіяй Шагала былі буржуазны нацыяналізм і містыка. Яго фармальнай устаноўкай быў «экстэматызм», адзін з відаў футурызма, які ставіць сабе задачай паказ руху жывых прадметаў у прасторы.

Доўгі час на вонкавых сценах дамоў, на парканах Віцебска можна было бачыць рэшткі роспісаў, зробленых Маркам Шагалам і яго вучнямі, хутка ім падрыхтаванымі. Роспісы гэтыя былі зроблены ў якасці ўпрыгожвання горада да святкавання першай гадавіны рэволюцыі.

Звычайны сюжэт іх быў—паказ лунаючага ў паветры над выгінастым бясконцым парканам старога яўрэя з доўгай барадой, ці паказ асобных постацей яўрэяў.

Цені пісаліся звычайна ярказялёнай фарбай, прасвятленні жоўтай охрай. У перакладзе на агульна зразумелую мову гэта павінна было азначаць выхад яўрэяў з «рысы аседласці» і аджываючы яўрэйскі быт.

Астатнія работнікі прадстаўлялі розныя фармалістычныя плыні: мастак Фальк, былы ўдзельнік выставак «Бубновы валет»—сезаніст, Кован—канструктывіст: ён навучаў жывапіснаму рэльефу, сутнасць якога зводзілася да наклейкі на плоскасць абрыўкаў абояў, кавалачкаў шкла, старых пакрышак ад кансерваных банак і т. п. З канца 1919 года паяўляецца К. Малевіч, вынаходца новага напрамку—супрэматызма. Афіцыйна гэты напрамак ставіў сабе задачай перадачу руху абстрактных цел у прасторы. Фактычна гэта была нічым не прыкрытая містыка.

Малевіч адмаўляў жывапіс, лічачы яго з'явай аджыўшай. Прадметам паказу былі: квадрат, які сімвалізуе сусвет, круг—рух зямлі, трохкутнік—бога, прадаўгаватыя чатырохкутнікі (супрэмы)—узаемадзеянне сіл. Звычайнымі фарбамі былі чорная і белая. Чорная азначала злы пачатак, белая—добры. Зрэдку дапускаліся іншыя фарбы. З іх кожная мела сваё значэнне. У Віцебску-ж Малевічам былі выдадзены брашуры «Бог не скінуты», «Царква і фабрыка», «Ад Сезана да нашых дзён» і ў рукапісе «Супрэматызм».

Такія найбольш характэрныя фігуры з ліку настаўнікаў мастацка-практычнага інстытута.

Сучаснаму чытачу гэта можа здацца зусім непраўдападобным, але трэба ўспомніць умовы і абстаноўку таго часу.

Уся гэта група, што называла сябе «левымі» ў выяўленчым мастацтве, па сутнасці ўяўляла сабою, як мы ўжо гаварылі, узбунтаваных дробных буржуа, якія прыкрывалі сваю контррэволюцыйную, варожую рабочаму класу ідэалогію «рэволюцыйнай» фразай. Зразумела, гэта адносіцца не да ўсіх мастакоў старых напрамкаў—вельмі многія, асабліва мастакі-рэалісты, працавалі пад кіраўніцтвам партыі і сваёй работай прыносілі вялікую карысць совецкай уладзе.

У той-жа самы перыяд часу ў горадзе Веліжы, былой Віцебскай губерні, працавала група мастакоў-рэалістаў у народнай мастацкай школе. Многае ў першыя годы рэволюцыі, калі совецкі дзяржаўны апарат толькі складаўся, залежала ад выпадковай прысутнасці мастака таго ці іншага напрамку, ад мясцовых органаў нарасветы.

Пачатак раз'езду фармалістаў супадае са сканчэннем грамадзянскай вайны. У 1921 годзе ад'ехаў Шагал з тым, каб неўзабаве эмігрыраваць заграніцу. У сярэдзіне 1922 года—Малевіч са сваімі найбольш блізкімі вучнямі, потым Фальк, атрымаўшы прафесуру ў маскоўскім ХУТЭІН'е, і іншыя. Інстытут адчуваў вострую патрэбу ў выкладчыках. Асноўная ўстаноўка інстытута прадаўжала быць фармалістычнай. Знішчыліся крайнасці, якія межаваліся з галіной псіхіатрыі, накшталт супрэматызма; пачаў працаваць у Інстытуце Ю. М. Пэн, працавала таленавітая моладзь, Юдовін, Бразер, Мінін. Але агульны тон аставаўся фармалістычным. Юрію Майсеевічу Пэну ў гэты час ужо падыходзіла да сямідзесяці год. Мітынгаваць, пераконваць другіх ён не ўмеў. Уздым, выкліканы рэволюцыяй, натхняў яго на творчую работу. Ён імкнуўся ахапіць новую тэматыку, і напісаў ў перыяд першых год рэволюцыі цэлы рад партрэтаў-карцін з жыцця працоўнай яўрэйскай бедпаты: «Кравец», «Часаўшчык», «Шкляр», «Булачнік», «Тынкоўшчык» і нарэшце—«Комсамолец-шавец». З іх лепшыя—«Кравец», «Часаўшчык»—напісаны з вялікай выразнасцю, маюць бясспрэчную жывапісную вартасць, але, вядома, у іх было-б дарэмна шукаць сапраўднага рэволюцыйнага зместу.

Яўрэйскі мастак гравер С. Б. Юдовін прыехаў у Віцебск у 1918 годзе. Нарадзіўся ён у Бешанковічах у беднай сям'і. Першапачатковую мастацкую адукацыю атрымаў у Ю. М. Пэна, потым вучыўся ў школе «Заахвочання мастацтваў» у Пецярбургу і ў прыватнай майстэрні мастака Бернштэйна.

С. Б. Юдовін прыехаў у Віцебск яшчэ вельмі маладым з вельмі малой мастацкай падрыхтоўкай. Тут на працягу пяці год ён працаваў, папаўняючы свае мастацкія веды, аддаючы галоўную ўвагу гравюры на дрэве. Тут развівалася і мацнела яго тэхніка. Зробленыя ім за гэты час гравюры на дрэве паказваюць віды і тыпы Віцебска. Яны гавораць аб вялікім пачуцці і разуменні тэхнікі драўлянай гравюры, фармальным майстэрстве. Але тым не менш яны надзвычай не аднолькавыя ў сваіх устаноўках. У іх адчуваецца яшчэ моцны ўплыў фармалістаў, што працавалі тады ў Віцебску, і яшчэ недастатковае валоданне малюнкам. У лепшых гравюрах гэтага перыяду ён узнімаецца да рэальнага вобраза, аднак, па сутнасці, яны з'яўляюцца творамі фармалістычнымі, перш за ўсё з боку зместу—рэволюцыя ў іх зусім нічым не адлюстравана. Мастак замкнуўся ў эстэтызацыі пакасіўшыхся хатак, старазаветных тыпаў, паэтызуючы адмоўныя бакі мінулага і звяртаючыся часам да прыёмаў поўнага скажэння рэчаіснасці.

Юдовін паехаў з Віцебска ў 1923 годзе, і з таго часу працуе ў Ленінградзе. Разам з Юдовіным у Віцебск у 1918 годзе прыехаў мастак-скульптар Бразер. Бразер нарадзіўся ў г. Кішэнёве. Вучыўся ў Кіеўскай рысавальнай школе, потым у Парыжы. У 1914 годзе паступіў дабравольцам у французскую армію. Пасля дэмабілізацыі, у 1918 годзе, разам з Юдовіным прыехаў у Віцебск. Тут ён працаваў у якасці тэатральнага мастака, выкладаў у школах і вельмі многа рабіў накідаў. У 1920 г. зрабіў першую сваю скульптурную работу—помнік Песталоцці. Бразер прыехаў з Парыжа пад моцным уплывам імпрэсіяністаў і навейшага французскага мастацтва Сезана, Гогена, скульптара Майоля. Сфера віцебскіх фармалістаў яму, вядома, не магла дапамагчы выйсці на шлях рэалізма, да якога ён пачаў прыходзіць значна пазней. Трэці настаўнік інстытута Мінін атрымаў першапачатковую мастацкую адукацыю ў Ю. М. Пэна, а потым займаўся ў віцебскім мастацкім практычным інстытуце, які і скончыў. Пералічаныя маладыя мастакі, бясспрэчна, не валодалі дастатковымі ведамі, каб весці адказную педагагічную работу. Апрача таго, яны знаходзіліся ў той час пад моцным уплывам фармалістаў. Прысутнасць мастака-рэаліста Ю. М. Пэна, які быў у старым узросце, не магла выратаваць справу. Ад фармалізма інстытут вызваліўся пасля праведзенай ў жніўні 1923 года рэарганізацыі яго ў мастацкі тэхнікум. Выкладчыкамі былі запрошаны мастакі, стаяўшыя на глебе рэальнага мастацтва і меўшыя вышэйшую мастацкую адукацыю.

Падводзячы вынікі гэтага перыяду у гісторыі выяўленчага мастацтва БССР, трэба прызнаць, што як ні шкоднай была дзейнасць фармалістаў, якая затармазіла развіццё ў нас совецкага мастацтва, атруціла ядам чужой ідэалогіі маладыя кадры,—самы факт адкрыцця мастацкай навучальнай установы ў Віцебску меў станоўчы рэзультат, бо ён выклікаў да жыцця маладыя таленты з асяроддзя рабочых, працоўных, сялянскай беднаты і т. д. Дзякуючы сваёй здаровай класавай самасвядомасці, гэтыя маладыя мастакі хутка забыліся на ўрокі сваіх першых настаўнікаў і ў выніку многія з іх сталі выдатнымі беларускімі совецкімі мастакамі.

Галоўлітбел № 3333. Газета «Літаратура і Мастацтва» выходзіць раз у пяцідзёнку. Адрас рэдакцыі: Менск, Савецкая, 68, Дом пісьменніка. Друкарня імя Сталіна. Адказны рэдактар І. ГУРСКІ.